WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ВЕРАСНЯ 2010 г. СУБОТА № 173 (26781)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

*Удзельнікам і гасцям урачыстасцяў Дня беларускага пісьменства*

**Паважаныя сябры!**

Дзень беларускага пісьменства — традыцыйнае свята, якое акцэнтуе ўвагу на неабходнасці захавання і развіцця багатай культурнай спадчыны і духоўных здабыткаў нашага народа.

Літаратура, мастацтва заўсёды былі для беларусаў асаблівай каштоўнасцю, крыніцай гістарычнай памяці, надзейнай апорай у выхаванні патрыятызму і высокіх маральных якасцяў грамадзян. Беларусь — радзіма многіх выдатных асветнікаў, дзеячаў культуры, пісьменнікаў сусветнага ўзроўню.

У нашай краіне клопат пра культуру, духоўнасць мае па-сапраўднаму дзяржаўны характар. Мы актыўна падтрымліваем развіццё нацыянальнага кнігавыдання і друку, ствараем усе ўмовы для праяўлення і росквіту сапраўдных талентаў.

Сёлетнія святочныя мерапрыемствы праводзяцца ў горадзе Хойніки, на гасціннай, прыгожай і непаўторнай палескай зямлі, якую ў сваіх творах уславіў выдатны беларускі пісьменнік Іван Мележ, дзе жывуць і плённа працуюць шчырыя і руплівыя людзі.

Сардэчна віншую вас са святам, жадаю моцнага здароўя, поспехаў, творчага натхнення і аптымізму.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# НОВАЯ ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА НА МЕЛЕЖАВАЙ ЗЯМЛІ

## Фотападарожжа па Хойніцкім краі









Амаль у паўтысячы кіламетраў адлеглаcць паміж папярэдняй сталіцай правядзення Дня беларускага пісьменства Смаргонню і сёлетняй, дакладней, заўтрашняй — Хойнікамі. Два супрацьлеглыя бакі Беларусі. Паазер'е і Палессе. Дзве зямлі, злучаныя дзясяткамі дарог і адной агульнай мовай, нягледзячы на разнастайнасць яе дыялектаў. Калі Смаргоншчыну ўжо другое стагоддзе называюць зямлёю Багушэвіча, Хойнікі і яго наваколлі завуць не інакш, як зямлёю Івана Мележа. Гэтыя атаясамленні — не толькі ад моваазнаўцаў і з вузкіх літаратуразнаўчых колаў. Сёння нават першакласнікі ведаюць сваіх славутых духоўных землякоў-папярэднікаў. «Не пакідайце ж мовы беларускай!» — заклікаў паэт-дэмакрат, калі яшчэ не існавала самастойная беларуская дзяржава, а «мужыцкая» мова была забароненая. Сёння мова — дзяржаўная. Свой галоўны твор «Людзі на балоце» Іван Мележ стварыў менавіта на ёй, бо закладваў сваю цаглiну ў нацыянальны духоўны падмурак. Мележаўская «Палеская хроніка» перакладзена на 13 моў свету! І ўжо гэта адно не патрабуе ніякіх доказаў, што мова Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Івана Мележа і Барыса Сачанкі, не тое што не горшая за іншыя, яна для нас — святая!

Здаецца, Хойнічыне надакучыла быць зямлёю толькі Чарнобыльскага болю. Без малога палова раёна апынулася за калючым дротам радыяцыйнай небяспекі, але і захаваную зямлю чыстай не назавеш. Вядома, гісторыю не перапішаш і лёс ужо не выправіш. Чарнобыль прыйшоў у гэты прыпяцкі край не на год і нават не на два з паловаю дзясяткі гадоў. На тысячы, калі не назаўсёды. Боль сціхае няспешна. Але зямля Мележа, насуперак выпрабаванням, хоча існаваць, развівацца, захоўваць багатыя палескія традыцыі, нараджаць літаратурныя таленты. І праводзіць святы. Сямнаццаты Дзень беларускага пісьменства ў Хойніках якраз можа стаць сапраўднай крыніцаю жыццёвага натхнення. Сёння мы друкуем здымкі з перадсвяточнага фотападарожжа Анатоля Клешчука, яго ўражанні ад шматлікіх сустрэч. Дарэчы, сімвалічна, свой самы першы фотарэпартаж для рэспубліканскага друку Анатоль Кляшчук зрабіў роўна дваццаць пяць гадоў таму менавіта на хойніцкай зямлі.

СТАР. 3

## Прэзідэнт Беларусі прыняў кадравыя рашэнні

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 верасня разгледзеў кадравыя пытанні.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

БОГУША Вадзіма Анатольевіча — намеснікам старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта;

МАРКОВІЧА Васіля Міхайлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Чэшскай Рэспубліцы;

СЕРПІКАВА Уладзіміра Міхайлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Славацкай Рэспубліцы;

СЛІЖЭЎСКАГА Алега Леанідавіча — старшынёй Рэспубліканскага працоўнага арбітражу;

ДУБКОВА Сяргея Вітальевіча — членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

ПАЛОНСКАГА Васіля Уладзіміравіча — членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

ЛІСІЦЫ Фёдара Дзянісавіча — першым намеснікам міністра лясной гаспадаркі;

КАЖУШКІ Казіміра Вікенцьевіча — намеснікам міністра лясной гаспадаркі;

КОРБУТА Аляксандра Мікалаевіча — намеснікам міністра лясной гаспадаркі;

МАРТЫНАВА Сяргея Вітальевіча — намеснікам міністра аховы здароўя;

АРНАУТАВА Алега Вячаслававіча — намеснікам міністра аховы здароўя — галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь;

ЯКЖЫКА Віктара Віктаравіча — намеснікам міністра адукацыі;

НЕСЦЯРОВІЧА Сяргея Анатольевіча — намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі;

СІЛЬЧАНКІ Анатоля Анатольевіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях;

КАЛТОВІЧА Уладзіміра Васільевіча — намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама;

РАДАМАНА Сяргея Мікалаевіча — намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама;

ЧОРНАГА Анатоля Барысавіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

ЗАХАРАНКІ Васіля Аляксеевіча — старшынёй Клімавіцкага райвыканкама;

ЖДАНЕНІ Анатоля Іосіфавіча — старшынёй Капыльскага райвыканкама;

ДАМАЦЕНКІ Фёдара Аляксандравіча — старшынёй Маладзечанскага райвыканкама;

АМЕЛЬЯНЧУКА Міхаіла Міхайлавіча — старшынёй Жодзінскага гарвыканкама;

ЧАСНАКА Ігара Мікалаевіча — старшынёй Крупскага райвыканкама;

БЕРАБЕНІ Аляксандра Фёдаравіча — Генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Беластоку (Рэспубліка Польшча);

АНОШКІ Аляксея Дзмітрыевіча — генеральным дырэктарам Беларускага дзяржаўнага аб'яднання па нарыхтоўцы, перапрацоўцы і пастаўцы лому і адходаў чорных і каляровых металаў — дырэктарам РУВП «Мінскдругасмет»;

КАВАЛЁВА Сяргея Мікалаевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельшкло»;

ТУРЧАКА Івана Рыгоравіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне»;

КАРЖА Івана Аляксеевіча — членам Гродзенскага аблвыканкама;

КОТАВА Мікалая Аляксандравіча — кіраўніком спраў, членам Мінскага гарвыканкама;

КАЛАСОЎСКАГА Алега Валер'евіча — намеснікам начальніка арганізацыйна-аналітычнага дэпартамента Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

## У Беларусі будуць адменены пасведчанні на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў

**У мэтах далейшай лібералізацыі эканамічнай дзейнасці кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб адмене абавязковага атрымання пасведчанняў на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у самыя кароткія тэрміны падрыхтаваць праект адпаведнага нарматыўнага прававога акта.**

Такі крок зроблены з улікам шматлікіх просьбаў арганізатараў канцэртаў і артыстаў. Цяпер яны абавязаны атрымліваць пасведчанне на кожны свой канцэрт або спектакль і плаціць за яго дзяржаўную пошліну, памер якой можа даходзіць да 300 базавых велічынь.

Такі парадак параджае залішнюю папяровую валакіту і дадатковыя фінансавыя расходы. У выніку церпяць артысты і гледачы.

Цяпер усе гэтыя перашкоды на шляху развіцця сучаснага, цывілізаванага шоу-бізнэсу ў краіне зняты. Замест дазвольнага будзе ўведзены паведамляльны прынцып арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў. Гэта дасць магчымасць дзяржаўным органам планаваць і рэгуляваць гастрольна-канцэртную дзейнасць, не ўшчамляючы інтарэсы гледачоў, артыстаў і прадзюсараў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## СВЕТЛЫЯ КРЫЛЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

**Багацце фарбаў, разнастайнасць формаў, тэхнік і памераў — сапраўдныя агледзіны беларускага мастацтва XX стагоддзя наладзілі ў межах рэспубліканскай выставы сучаснага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Зямля пад белымі крыламі» ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. 3 верасня адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы, на якой, дарэчы, прадстаўлена больш за 150 аўтараў. Экспазіцыя ўражвае сваёй усёабдымнасцю, але працуе да 4 кастрычніка — работы беларускіх мастакоў паспеюць пагледзець усе ахвотныя.**



На выставе прысутнічалі дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, міністр культуры Павел ЛАТУШКА і мастак Рыгор СІТНІЦА.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На адкрыцці **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА** адзначыў:

— «Зямля пад белымі крыламі» — гэта словы выбітнай асобы, Уладзіміра Караткевіча, які ўклаў душу і сэрца ў нашу краіну Беларусь. Ім могуць ганарыцца не толькі беларусы, але і ўся культурная Еўропа. «Зямля пад белымі крыламі» — гэта мая краіна, гэта мая зямля, дзеля якой я жыву і працую. Я думаю, што кожны мастак сёння можа так сказаць пра сябе. Калі мы паглядзім на цудоўныя творы, якія прадстаўлены тут, то мы пабачым, што мастакі дэманструюць сваё стаўленне да радзімы. Неабыякавасць разумення сваіх каранёў стварае адпаведны падмурак для будовы і развіцця культуры... У нашых бліжэйшых планах — стварэнне спецыяльнага інстытуту, які будзе займацца прасоўваннем беларускай культуры за мяжой.

«Зямля пад белымі крыламі» займае 7 пляцовак (галерэя, залы першага паверха і фае) Нацыянальнага музея. Па экспазіцыі вандруеш, як па нейкім магічным лабірынце, на кожным рагу знаходзячы новае дзіва. Эклектыка — прынцып існавання ўсяго зямнога. Не выключэннем стала і наша «Зямля...». Выстава неаднародная і стракатая, — і ў гэтым яе хараство.

«Першапачатковая задума была — паказаць тое, што было створана ў Беларусі за апошнія 20 гадоў, — распавядае **Вольга АРХІПАВА, навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага выяўленчага мастацтва Нацыянальнага музея РБ**. — Але, паколькі народныя мастакі стваралі і раней, то мы змясцілі і іх творы ранейшага перыяду. У іншых залах паказаны зусім «свежыя» работы і сталых мастакоў, і моладзі — творцаў да 30 гадоў. На гэтай выставе мы вырашылі паказаць новыя, так бы мовіць, набыткі: тое, што набывалася нашым музеем і Міністэрствам культуры ў апошнія некалькі гадоў. Хоць ёсць і прывезеныя непасрэдна мастакамі творы».

Асноўную частку выставы складаюць работы народных мастакоў Беларусі Міхаіла Савіцкага, Гаўрыіла Вашчанкі, Мая Данцыга, Арлена Кашкурэвіча, Уладзіміра Стэльмашонка, Уладзіміра Тоўсціка, Леаніда Шчамялёва і інш., лаўрэатаў дзяржаўнай прэміі Беларусі Віктара Альшэўскага, Анатоля Арцімовіча, Анатоля Бараноўскага, Валянціна Дранца, Мікалая Казакевіча, Валерыя Славука, Валерыя Шкарубы і інш., заслужаных дзеячаў мастацтва Сяргея Волкава, Валерыя Леантовіча, Зоі Літвінавай, Людмілы Мягковай, Івана Сталярова, Васіля Сумарава, Нінэлі Шчаснай і інш., стыпендыятаў спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Ганны Конанавай, Вольгі Мельнік, Алесі Скарабагатай, Дзяніса Чубукова, Антона Шапялевіча і інш. Для кожнага наведвальніка «Зямля пад белымі крыламі» пачынаецца непарушна і ўпэўнена — скульптурай. Яна займае фае музея і прасякнута нацыянальным духам: бюст Казіміра Семяновіча, макет помніка Янку Купалу, бюст Настаўніцы...

Своеасаблівым адкрыццём з'яўляецца зала, дзе змешчаны работы маладых беларускіх мастакоў-стыпендыятаў. Яны дэманструюць сапраўдную свабоду творчасці, смеласць у выбары тэхнікі і маштабаў. Вось, напрыклад, трыпціх Дзяніса Чубукова «Тры каралі» ўражвае памерамі палотнаў, вобразнасцю і сімвалізмам: тры каралі сімвалізуюць трох біблейскіх вешчуноў з трох розных частак свету. Прычым аўтарская інтэрпрэтацыя біблейскіх персанажаў падаецца вельмі арыгінальнай. Прадстаўлены творы Вольгі Мельнік, якая працуе ў вельмі складанай тэхніцы ляўкас (гэтая тэхніка прыйшла ў выяўленчае мастацтва з іканапісу). Разам з універсальнасцю тэмаў і матываў народны каларыт і павага да Радзімы адчуваюцца ў работах маладых. Гэта, відаць, і ёсць тая самая пераемнасць традыцый, якую хацелі падкрэсліць арганізатары выставы. А значыць, у беларускага мастацтва ёсць будучыня.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

### Надвор'е

## У ВЫХАДНЫЯ ЧАКАЮЦЦА ПЕРШЫЯ ЗАМАРАЗКІ

**Цыклон, які значна пагоршыў надвор'е ў Беларусі ў пачатку верасня, паступова змяшчаецца на паўночныя раёны Расіі. Атмасферны ціск расце, таму гэтай ноччу ўжо не будзе ападкаў, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У нядзелю Беларусь у асноўным акажацца на ўскраіне Скандынаўскага антыцыклону. Аднак на поўдні краіны можа яшчэ прысутнічаць уплыў малаактыўных атмасферных франтоў, таму 5 верасня чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна па паўднёвай палавіне Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Будзе ўмераны паўночна-ўсходні вецер. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны чакаецца ад 2 цяпла на поўначы да плюс 11 па поўдні краіны.

У паўночных раёнах Беларусі бліжэй да раніцы ў нізкіх месцах на глебе магчымы слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Днём у нядзелю тэмпературны фон складзе плюс 11-17 градусаў. На паўднёвым усходзе рэспублікі паветра прагрэецца да плюс 19 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Да сярэдзіны тыдня начная тэмпература складзе 4-11 градусаў цяпла. Днём будзе ў межах плюс 13-19 градусаў.

### Трагедыя

## УСЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ АВАРЫІ ЗАГІНУЛІ

**2 верасня каля 21 гадзіны на аўтадарозе «Магілёў—Чавусы» паблізу вёскі Благавічы адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі 3 чалавекі.**

Як паведамілі ў Магілёўскай ДАІ, аўтамабіль «Фальксваген-Пасат», якім кіраваў 48-гадовы мужчына, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з «Фальсвагенам-Гольфам». Гэты аўтамабіль пераўтварыўся ў кучу металу. Жонка і муж з Крычава, 57 і 62 гадоў, загінулі на месцы. Смяротную траўму атрымаў і вадзіцель «Пасата».

**Ілона ІВАНОВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У РАСІІ ЗНОЎ РЫХТУЕЦЦА ЗВАЛЬНЕННЕ «ЛІШНІХ» ЧЫНОЎНІКАЎ

**У пачатку наступнага тыдня прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў правядзе спецыяльную нараду, на якой у чарговы раз пойдзе гаворка пра скарачэнне служачых дзяржапарату. Крыніца, блізкая да адміністрацыі Крамля, паведаміла «Независимой газете», што скарачэнне штату чыноўнікаў насамрэч не самамэта, а заявы першых асобаў дзяржавы на гэты конт хутчэй разлічаныя на электаральны эфект.**

Іншае пытанне, якое ў адміністрацыі прэзідэнта лічаць больш важным, — пазбаўленне дзяржавы ад залішніх функцый. На думку назіральнікаў, гэта прымушае падазраваць улады ў імкненні хутчэй зняць з сябе адказнасць за дрэнна пракладзеныя дарогі, дахі, што правальваюцца, нясвежыя малочныя прадукты, шкодныя цацкі і гэтак далей, і да таго падобнае.

Перакласці адказнасць, паводле задумы адміністрацыі прэзідэнта, плануецца на прафесійныя асацыяцыі — так званыя самарэгулюемыя арганізацыі (СРА). Закон аб іх дзейнічае з канца 2007 года і ўжо не раз падвяргаўся рэдагаванню.

### 200-ГАДОВАЕ ПІВА ПАДНЯЛІ З ДНА БАЛТЫКІ



**Шведскія вадалазы паднялі з дна Балтыкі найстарэйшае шампанскае і выявілі на тым жа патанулым судне яшчэ і самае старое піва, піша фінская газета Helsingin sanomat.**

На думку спецыялістаў, узрост піва, як і шампанскага, налічвае каля 200 гадоў. Мяркуецца, судна з грузам піва і шампанскага накіроўвалася ў Санкт-Пецярбург і затанула прыкладна ў канцы XVIII або пачатку XIX стагоддзя. Мясцовыя ўлады вырашылі падняць груз. Да гэтага часу была вядомая знаходка самага старога піва, якое было выробленае ў бровары Worthington White Shield у 1869 годзе. Раней эксперты ацэньвалі кошт кожнай са знойдзеных бутэлек шампанскага ў некалькі дзясяткаў тысяч еўра. Пра кошт піва яны пакуль нічога сказаць не могуць. Шампанскае, дарэчы, таксама можа аказацца самым старым у свеце, паколькі дата вытворчасці самага старога на сёння зарэгістраванага шампанскага Perrier-Jouet датаваная 1825 годам.

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

### НОВЫЯ ПАЖАРЫ Ў РАСІІ ВЫЛІЛІСЯ Ў ПЯЦЬ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ



**Па факце новых прыродных пажараў у Валгаградскай вобласці, колькасць ахвяраў якіх, паводле апошніх звестак, узрасла да васьмі чалавек, органы Дзяржпажнагляду РФ завялі пяць крымінальных спраў. Пра гэта ІТАР-ТАСС паведаміў у пятніцу выканаўца абавязкаў старшага памочніка пракурора вобласці Алег Пікураў. Акрамя таго, следчы камітэт пры пракуратуры ў Валгаградскай вобласці праводзіць працэсуальную праверку на прыкметы злачынства па артыкуле «халатнасць», у рамках якога будзе дадзена ацэнка дзеянням або бяздзейнасці службовых асобаў, адказных за забеспячэнне пажарнай бяспекі.**

Загарэліся лясы і ў Саратаўскай вобласці, але яны ўжо цалкам патушаныя. Усяго агонь знішчыў 30 дамоў, у тым ліку 20 жылых. Ахвяраў і пацярпелых няма. Самым моцным аказалася ўзгаранне ля сяла Аляксееўка. Відавочцы распавялі, што агонь дайшоў да чыгункі ля Аляксееўкі і ледзь не ахапіў станцыю. Але пажарным своечасова дапамаглі дажджы, і пажару на станцыі ўдалося пазбегнуць.

### КАЛІ МУЖ БОЛЬШ ШЧАСЛІВЫ, ЧЫМ ЖОНКА, — ЯНА ПАДАСЦЬ НА РАЗВОД

**Сакрэты сямейнага шчасця і моцных шлюбных адносінаў раскрылі аўстралійскія навукоўцы: мужу не варта паказваць, што ён атрымлівае ад шлюбу больш задавальнення, чым жонка. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы аўстралійскага Універсітэта Дзікіна, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.**

«Мы павінны папярэдзіць жанатых мужчын, што калі яны будуць адкрыта паказваць сваёй палове, што з'яўляюцца больш шчаслівымі ў шлюбе, то ім можна смела рыхтавацца да разводу», — цытуюць газеты высновы аўстралійскіх навукоўцаў.

Даследаванне праводзілі эканамісты. Яны назвалі выяўлены феномен «Дыстанцыяй шчасця». Прааналізаваўшы дзясяткі тысяч шлюбных саюзаў у Аўстраліі, Вялікабрытаніі і Германіі, яны высветлілі, што гэты эфект спрацоўвае толькі ў адным кірунку: калі муж больш шчаслівы ў шлюбе, чым жонка, тая падасць на развод, але не наадварот. Разрыў паміж адчуваннямі сужэнцаў павялічваецца, калі жонка перагружаная хатнімі справамі, а таксама ў выпадку, калі яны з мужам паходзяць з розных сацыяльных груп, альбо калі яе даход значна вышэйшы за сярэдні. Але ён знікае, калі муж і жонка адносяцца да аднаго кола, калі вызнаюць адну і тую ж веру, калі муж бярэ на сябе частку хатніх клопатаў, калі жонка не ходзіць на працу, застаючыся хатняй гаспадыняй, калі яна студэнтка або пенсіянерка. «Даследаванне паказвае, што немагчыма прадухіліць развод такой пары, пераразмеркаваўшы завышаны ўзровень шчасця мужа да жонкі. Муж не можа падзяліцца з жонкай сваім шчасцем», — тлумачаць навукоўцы.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

*Заставайцеся з намі!*

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 10 СЕНТЯБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений в решения Общего собрания акционеров по вопросам об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 7 сентября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 10 сентября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 7 сентября 2010 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.**

УНП 100325912.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.09.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 015,00 | 1 чэшская крона | 156,40 |
| 1 еўра | 3 866,13 | 1 польскі злоты | 976,53 |
| 1 латвійскі лат | 5 459,48 | 1 расійскі рубель | 98,25 |
| 1 літоўскі літ | 1 120,84 | 1 украінская грыўня | 381,40 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,6922 |
| 10 UAH | 38,8322 |
| 1000 BYR | 10,1765 |
| EUR | 39,3505 |

ISSN 1990 - 763X

## Большасць грамадзян Беларусі заяўляе аб адсутнасці ў краіне дыскрымінацыі па нацыянальнай і рэлігійнай прыкметах

У Беларусі адсутнічае дыскрымінацыя па нацыянальнай, рэлігійнай і моўнай прыкметах. Аб гэтым заявіла большасць удзельнікаў сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў ліпені гэтага года Аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў цэнтры.

Каля 74,9 працэнта рэспандэнтаў заявілі, што ў Беларусі няма ўціску па нацыянальнай, 71 працэнт — па рэлігійнай і 69,3 працэнта — па моўнай прыкметах. На думку 13,1 працэнта ўдзельнікаў апытання, яны часам сутыкаюцца з фактамі дыскрымінацыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, а яшчэ 3,7 працэнта апытаных заявілі аб тым, што гэта адбываецца часта. 14,3 працэнта грамадзян Беларусі лічаць, што ў краіне часам мае месца дыскрымінацыя па рэлігійнай прыкмеце, 1,6 працэнта — што правы вернікаў парушаюцца часта. Аб рэдкіх фактах дыскрымінацыі па моўнай прыкмеце заявілі 15,4 працэнта ўдзельнікаў апытання. У ходзе даследавання было апытана 1,4 тыс. грамадзян Беларусі ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшых. Памылка выбаркі — у дапушчальных межах.

## ЛІЦЭНЗІЙ — ЗНАЧНА МЕНШ

**Колькасць ліцэнзій, што выдаюцца ў Беларусі, павінна зменшыцца прыкладна на 60 працэнтаў — такім чынам пракаментаваў з'яўленне новага ўказа «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці» намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур.**

Як заўважыў Андрэй Тур, указ № 450 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці», мае некалькі прынцыповых момантаў. У прыватнасці, тэрмін працэдуры ліцэнзавання зменшыцца з 30 да 15 дзён. Але ці не галоўнае, што колькасць відаў дзейнасці, якія мусяць ліцэнзавацца, скарачаецца адразу на 16 пазіцый. Прычым, у тым ліку, гэта датычыцца рознічнага гандлю — за выключэннем гандлю падакцызнымі таварамі.

Апроч таго, яшчэ па 14 відах дзейнасці, якія па-ранейшаму патрабуюць ліцэнзавання, скарачаецца каля 60 работ і паслуг. І яшчэ адзін цікавы момант. Па 16 відах дзейнасці ліцэнзіі будуць выдавацца не на пяць, а адразу на 10 гадоў. Па напрамках дзейнасці, дзе скасоўваецца ліцэнзаванне, будуць уведзены іншыя формы кантролю. Канкрэтныя шляхі рэгулявання тут будуць вызначаныя да новага года. Пры гэтым намеснік міністра зазначыў: у сувязі з неабходнасцю вызначыцца з парадкам рэгулявання ў тых сферах, дзе ліцэнзаванне скасоўваецца, указ пачне дзейнічаць з 1 студзеня наступнага года. Аднак фізічныя, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, па дзейнасці якіх ліцэнзіі будуць скасаваныя, у выпадку заканчэння тэрмінаў дзейнасці ліцэнзій да гэтага часу могуць іх не пераафармляць. Тым часам, адзначыў Андрэй Тур, цяперашні ўказ — дакумент не канчатковы. Работа ў гэтым напрамку працягнецца. «Паступова ў галіне ліцэнзавання мы павінны прыйсці да пэўнага аптымальнага мінімуму, скажам, да ліцэнзавання па 10-15 пазіцыях», — выказаў думку намеснік міністра.

Дарэчы, варта заўважыць, што пакуль у Беларусі ліцэнзуецца 51 від дзейнасці. Пры гэтым указ № 450 увёў ліцэнзаванне па адным новым для нашай краіны напрамку — дзейнасці, звязанай з атамнай энергетыкай.

**Сяргей ГРЫБ.**

## «ТАНЧЫ І НІ ПРА ШТО НЕ ДУМАЙ»

У Мінску стартуе «Аксамітны сезон-2010»

Неяк давялося чытаць, што Грэта Гарбо і Клара Боў зламалі б абцасы, танцуючы пад Parov Stelar. Беларускія меламаны могуць скакаць ад шчасця: Parov Stelar Band едуць у Беларусь. Іх выступленне прымеркавана да першага ў Беларусі фестывалю «Аксамітны сезон-2010». Як сцвярджае сайт фестывалю barhat.by, 20-40-я гады мінулага стагоддзя называлі аксамітнымі, бо гэта быў час свінгу. Музычны кірунак і танец пад назвай «свінг» даваў людзям зарад жыццярадаснасці і аптымізму. Арганізатары мінскага «сезона» гэтую ідэю вырашылі паглыбіць, таму абвясцілі пра новае прачытанне аксаміту — гэта перыяд, калі трэба ўцягнуць у сябе астаткі лета і атрымліваць станоўчы зарад энергіі танцавальнай музыкі да наступнай вясны. Фестываль запланаваны на два дні. Ён пройдзе 3-4 верасня ў парку прыгод «Крутагор'е» пад Мінскам. Акрамя музыкі гасцей фестывалю чакаюць гульні на свежым паветры, катанне на конях, пейнтбол, дзённыя сямейныя праграмы. 4 верасня на дзвюх пляцоўках фестывалю — госці з Германіі, Літвы, Расіі, Украіны.

Асобна выступяць майстры электроннага свінгу аўстрыйскага калектыву Parov Stelar Band, якія ўвасабляюць авангард неасвінгу. Parov Stelar лёгка камбінуе брэйкбіт з джазам 1930-х: джаз і чарльстон, змяшаныя з балканскімі матывамі і патрэскваннем рэтра-пласцінак. Дэвіз фестывалю — танчы і ні пра што не думай.

**Ілья ЛАПАТО.**

## «БЕЛАРУСЬ МАЕ ЎНІКАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ІЗРАІЛЬСКАГА ТУРЫЗМУ»

**Пра гэта па выніках прэс-тура ізраільскіх журналістаў у Беларусь заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Эдуард ШАПІРА.**

— Тэма турызму стане адным з галоўных эканамічных напрамкаў пасольства Ізраіля ў Беларусі, — падкрэсліў пасол. — І пакуль ізраільскія турысты адкрываюць для сябе Беларусь, я ў сваю чаргу хачуператварыць пасольства Ізраіля ў Беларусі ў адно з самых адкрытых і прывабных для беларускіх турыстаў. Разам з тым мы прыкладзём усе намаганні, каб атрыманне візы ў нашу краіну стала для беларусаў самым лёгкім у параўнанні з іншымі краінамі.

Прэс-тур стаў першым турам ізраільскіх журналістаў у Беларусь. У ім удзельнічала дзевяць журналістаў вядучых СМІ Ізраіля, якія выходзяць на трох мовах (іўрыце, рускай і англійскай) і ахопліваюць усе сацыяльныя групы насельніцтва гэтай краіны.

Як распавёў **галоўны рэдактар ізраільскага інфармацыйнага агенцтва «Курсор» Макс ЛУР'Е**, тур хоць і быў эксперыментальным, але ён удаўся:

— Нашы ўражанні ў многім перасягнулі нашы чаканні. Мы пазнаёміліся з геатурызмам, сельскім турызмам. Але не толькі: Беларусь — радзіма многіх палітычных і грамадскіх дзеячаў сённяшняга Ізраіля. І паміж нашымі краінамі шмат агульнага, а найперш — людзі.

— Усё пачынаецца з людзей, — дадае **рэдактар газеты «The Jerusalem Post» Лоўрэнс РЫФКІН**. — Цеплыня і дабрыня беларусаў — аснова беларускага турызму. У гэтым я бачу вялікі поспех. Плюс да ўсяго — ініцыятыва і прадпрымальніцтва, якія мы адчулі ў гаспадароў беларускіх аграсядзіб. Яшчэ здзівіла чысціня, парадак і дарогі — нават у вёсках яны добрыя. І хоць, вядома, траплялiся і калдобiны — галоўнае, што гэтыя вёскі дасяжныя. У турызме гэта вельмі важна.

### «Патэнцыял нашых краін у сферы турызму выкарыстоўваецца не ў поўную сілу»

За 2009 год больш за 10 тысяч грамадзян Ізраіля (10 021 чалавек) наведала Беларусь. Прыблізна столькі ж — 9986 беларусаў — наведала Ізраіль.

— На сёння мы маем вялікую двухбаковую цікавасць у сферы турызму, — гаворыць **намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Часлаў ШУЛЬГА**. — Але суседнюю Польшчу ізраільцяне наведваюць у тры разы часцей, Літву — у чатыры разы часцей. Перспектыву супрацоўніцтва мы бачым у стварэнні камбінаваных тураў, для беларусаў жа плануецца пашырыць адукацыйныя, лячэбныя, паломніцкія туры ў Ізраіль. Сёння мы спрабуем стварыць максімальныя ўмовы для кааперацыі нашага бізнэсу ў сферы турызму. Я лічу, што патэнцыял, які ёсць у нашых краінах для развіцця турызму, выкарыстоўваецца далёка не цалкам. Але ўсе ўмовы, каб павялічыць гэтыя паказчыкі ў два, а то і ў тры разы, у нас ёсць.

— Пры адной і той жа колькасці насельніцтва, тэрыторыя Ізраіля ў 10 разоў меншая, чым тэрыторыя Беларусі, — дадае **карэспандэнт газеты Haaretz Daily Newspaper Машэ ГІЛАД**. — У параўнанні з Ізраілем у Беларусі больш лясоў, вады і зеляніны, у параўнанні з Еўропай — сваё, з захаваннем традыцый, жыццё вёскі. У Беларусі велізарны патэнцыял. Але, тым не менш, для большасці ізраільцян Беларусь — гэта terra inkognita. Пры правільным прасоўванні і маркетынгу Беларусі турызм у вашу краіну можна зрабіць вельмі папулярным у Ізраілі. Толькі ёсць цяжкасці: першая — віза, другая — дарожныя знакі (няма надпісаў на англійскай мове).

У падмацаванне сваіх слоў Машэ Гілад прывёў прыклад Грузіі, візавы рэжым з якой Ізраіль адмяніў ужо пяць гадоў таму. Сёння Грузію наведвае каля 50 тысяч ізраільцян штогод.

Як адзначыў Часлаў Шульга, віза ў Беларусь для грамадзян Ізраіля сапраўды ў некалькі разоў даражэйшая, чым ізраільская віза для беларусаў. Але, паводле яго слоў, Мінспорт ужо вядзе перамовы з Міністэрствам замежных спраў, каб візавы рэжым для іншаземцаў зрабіць больш спрыяльным для развіцця ўязнога турызму.

**Ілья ЛАПАТО.**

### «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ»

У чэрвені выставы работ беларускіх мастакоў Уладзіміра Вішнёўскага, Уладзіміра Зінкевіча і фотамастака Юрыя Іванова прайшлі ў Вільнюскай ратушы. А акцёры Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы наведалі Фінляндыю, дзе ў межах акцыі купалаўцы паказалі свае лепшыя спектаклі «Вечар» Аляксея Дударава і «С.В.» па матывах «Вішнёвага сада» Антона Чэхава.

У жніўні ў Хоцімску і Салігорску прайшлі канцэрты зорак беларускай эстрады. Першы з гарадоў наведала Ірына Дарафеева, у другім з сольным канцэртам выступіла Іна Афанасьева.

— Калі ёсць свята, якое аб'ядноўвае, і калі ёсць слухачы, якія атрымліваюць станоўчыя эмоцыі — гэта заўсёды радуе, — гаворыць «Звяздзе» **заслужаная артыстка Беларусі Іна АФАНАСЬЕВА**. — «Беларусы — гэта мы» — несумненна, адна з такіх акцый.

— Не так важная назва, колькі важная атмасфера, якую гэта акцыя нясе. Яе маральная і духоўная ідэя, — дзеліцца ўражаннямі **заслужаная артыстка Беларусі Ірына ДАРАФЕЕВА**. — Адчуванне шчасця, маладосці і незалежнасці Беларусі — вось складнікі нашай будучыні. З пачатку года ў працяг майго тура «Дарогамі Перамогі» стартавала канцэртная праграма «Вітаю, Любоў». Гэтая ж праграма дала пачатак працягу майго тура па Магілёўшчыне «Пад мірным небам», дзе мы запланавалі аб'ехаць усе 23 раёны вобласці.

**Ілья ЛАПАТО.**

### Абзац

◢ У Мінску пачынаецца будаўніцтва 25-павярховага будынка бізнэс-цэнтра «Футурыс» вышынёй 103 м. Урачыстае адкрыццё пачатку будаўніцтва адбылося ўчора. Будынак размесціцца на перасячэнні праспекта Незалежнасці і МКАД. На 25-і паверхах размесціцца 45 тыс. кв.м офісных і гандлёвых памяшканняў.

◢ **П'яны кіроўца аштрафаваны на Br10,5 млн у Магілёўскай вобласці. У судзе Краснапольскага раёна завяршыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да кіроўцы, які сеў за руль у стане алкагольнага ап'янення. Летась яго ўжо судзілі за такое ж правапарушэнне, тады ён быў пакараны штрафам у памеры 100 б.в. (Br3,5 млн). На гэты раз пакаранне яшчэ больш строгае — штраф у 300 базавых (Br10,5 млн), а таксама пазбаўленне права займаць пасады або займацца дзейнасцю, звязанай з кіраваннем транспартнымі сродкамі, тэрмінам на 4 гады.**

◢ Арсенал боепрыпасаў выяўлены ў лесе ў Мінску. Артылерыйскі снарад калібру 37 мм, а таксама 21 снарад калібру 75 мм з узрывальнікамі, рэактыўная міна калібру 210 мм, 26 узрывальнікаў і рэактыўная граната былі знойдзены вайскоўцамі ў лесе на вуліцы Красіна (раён Сосны). Было ўстаноўлена, што ўсё гэта — боепрыпасы часоў апошняй вайны. Небяспечныя знаходкі знішчыла група размініравання.

◢ **ДАІ ў Маскве ўчора перафарбавала коней у зебраў, каб пераканаць кіроўцаў берагчы дзяцей-пешаходаў. Акцыя «Увага: дзеці ідуць у школу» праводзілася на Смаленскай плошчы. Галоўнымі героямі сталі белыя коні, пафарбаваныя пад зебру — сімвал пешаходнага пераходу. Пакуль гарэла зялёнае святло, удзельнікі акцыі пераводзілі па пераходзе коней, а вадзіцелям раздавалі стыкеры «Я люблю пешаходаў», «Мой выбар — бяспечная зебра», «Не ўбачыш дарогу ў палосачку, убачыш неба ў клетачку». У скверы непадалёк малыя каталіся на поні, таксама пафарбаваных у чорную палоску. Для расфарбоўкі жывёлін выкарыстalі, як сцвярджаецца, фарбу «аквагрын» на воднай аснове, якая не раздражняе скуру жывёлін. Тым не менш абаронцы жывёл асудзілі арганізатараў за расфарбоўку коней.**

### Поўны абзац

◢ Камар, што ўмудрыўся заляцець у рот тайваньскай тэлевядучай, стаў вінаўнікам зрыву выпуску тэленавінаў у прамым эфіры. Маскіт пралез у дыхальныя шляхі вядучай і ўкусіў яе ў вобласці трахеі. Гэта справакавала ў жанчыны прыступы кашлю і ўдушша. У выніку давялося праграму тэрмінова перапыніць і запусціць блок рэкламы. На працягу гэтага часу рэдакцыя шукала замену няшчаснай вядучай, якую давялося шпіталізаваць. «Ніколі не думала, што камары здольныя так балюча джаліць», — здзіўляецца тэлевядучая, якой з-за шкоднага насякомага давялося цэлы дзень правесці на бальнічным ложку.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Францыі

## І ДАЙШЛІ ЯНЫ ДА ГОРАДА ПАРЫЖА...

**Учора на легендарным стадыёне «Сен-Дэні» ў Парыжы нацыянальная зборная Беларусі правяла свой першы ў гэтым сезоне адборачны матч да ЧЕ-2012 супраць каманды Францыі. На момант падпісання газеты ў нумар паядынак яшчэ не пачынаўся, таму падрабязнасці і ўсё, што было з ім звязана, у наступным нумары. Пакуль жа адзначым, што гульня ў французскім футбольным бамондзе мела вялікі рэзананс.**

Напярэдадні на трэніроўку сваёй былой зборнай прыбыў Зінедзін Зідан. Па мясцовым тэлебачанні ў раздзеле навінаў у кожным выпуску французскія тэлекаментатары не забывалі нагадаць, што ў пятніцу вечарам чакаецца дэбют нацыянальнай каманды Францыі пад кіраўніцтвам новага настаўніка Ларана Блана. На карту для гаспадароў было пастаўлена шмат: страчаны імідж, сусветны рэйтынг, падмочаная рэпутацыя ў вачах балельшчыкаў... Хоць многія з іх, відаць, не вераць у хуткае аднаўленне статусу французаў часоў Мішэля Плаціні і таго ж самага Зінедзіна Зідана. Напрыклад, таксіст, які падвозіў з аэрапорта групу беларускіх журналістаў у гатэль нават і вухам не павёў, калі мы пачалі яго распытваць пра будучы паядынак. У лабірынтах парыжскага метро народ таксама не быў заняты футбольнай тэматыкай. Бадай, больш за ўсё іх цікавіла палітыка Нікаля Сарказі, пра што нагадвалі газетныя аркушы ў руках парыжан.

Для беларускай каманды гульня таксама мела надзвычай важнае значэнне. Ну, па-першае, упершыню (калі не лічыць 1992 года, калі нашы футбалісты сустракаліся са зборнай клубаў Францыі і ўступілі 0:2). Праўда, тады, у перыяд станаўлення Беларускай федэрацыі футбола, гэты матч наўрад ці трапіў у аналы гісторыі, хоць у статыстычныя звесткі адназначна. Зразумела, што не пашкодзіла б вярнуць даўгі.

За суткі да пачатку сустрэчы на «Сэн-Дэні» нацыянальная зборная Беларусі правяла трэніроўку, за якой уважліва сачылі французскія журналісты. Нічым асаблівым ад іншых перадгульнявых спарынгаў яна не адрознівалася, але ж у душы чамусьці трымалася ўпэўненасць, што на гэты раз усё ў нас атрымаецца. І паход у Парыж стане паспяховым і шчаслівым.

Гэты перафразаваны выраз з аднаго вядомага мульціка, агучанага Яўгенам Лявонавым, падкрэслівае памкненне аднаго з герояў дзіцячага фільма пайсці за шчасцем у Парыж разам са сваімі казачнымі сябрамі.

Нацыянальная зборная Беларусі па футболе сёння таксама ў Парыжы, дзе ў 21.00 па мясцовым часе (22.00 па-беларускім) паспрабуе здабыць шчасце на гістарычнай арэне «Стад дэ Франс», дзе французская каманда ў 1998 годзе першы і пакуль апошні раз пад сцягам Зінедзіна Зідана стала чэмпіёнам свету...

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Парыж.*

Футбол

## У ТОП-350 УВАЙШЛІ ТРЫ БЕЛАРУСКІЯ КЛУБЫ

### ПРЫЧЫМ УСЕ ЯНЫ ЗА МЕСЯЦ СВАЕ ПАЗІЦЫІ ПАЛЕПШЫЛІ

**Міжнародная федэрацыя футбольнай статыстыкі і гісторыі апублікавала абноўлены рэйтынг-ліст наймацнейшых клубаў свету. Усе беларускія клубы, якія ўвайшлі ў топ-350, свае пазіцыі ў рэйтынгу палепшылі.**

Два першыя месцы дзеляць італьянскі «Мілан» і іспанская «Барселона», за імі нямецкі «Баер». «Чэлсі», «Ліверпуль», «Андэрлехт», «Атлетыка» — на верхніх пазіцыях рэйтынгу, па традыцыі, сусветныя гранды.

Чэмпіён краіны барысаўскі БАТЭ за месяц падняўся на 5 пазіцый і займае 47-ы радок, маючы 162 ачкі. Адзначым, што ўсе супернікі нашага клуба ў Лізе Еўропы знаходзяцца ў топ-350 ніжэй. Кіеўскае «Дынама» займае 60-ты радок, галандскі «Алкмаар» — 119-ты, а «Шэрыф» з Малдовы ўвогуле не ўвайшоў у рэйтынг. Найвышэйшы ў рэйтынгу расійскі клуб, маскоўскі ЦСКА, IFFHS таксама паставіла на больш нізкае месца — 54-е, піцерскі «Зеніт» — 76-ты, казанскі «Рубін» — 98-ы.

Яшчэ два нашы прадстаўнікі ў лізе Еўропы, якія выбылі на стадыі плэй-оф — сталічнае Дынама і магілёўскі «Днепр» — размясціліся на 211-219 месцах, дзе з аднолькавай колькасцю ачкоў (84) знаходзяцца 9 клубаў. Прычым сталічнае «Дынама» за месяц палепшыла свой рэйтынг на 63 пазіцыі, а магілёўскі «Днепр» — на 79!

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Зміцер ВАЙЦЮШКЕВІЧ:

## «МУЗЫКА ПАВІННА ЎЗРУШВАЦЬ, А НЕ ЗАКАЛЫХВАЦЬ «ОЙ, ЯК ПРЫГОЖА ЎСЁ...»

**Толькі ўзнёслыя душы твораць дабро. А такія ёсць і сярод беларускіх знакамітасцяў. Пацвердзіць гэта ўзяліся супрацоўнікі сацыяльнага цэнтра Кастрычніцкага раёна, якія арганізавалі акцыю «Яркае жыццё». У яе межах артысты, мастакі, прадстаўнікі шоу-бізнэсу будуць прыязджаць у цэнтр для таго, каб сустрэцца з маладымі людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Такая «тэрапія зносін» накіравана на тое, каб звярнуць увагу грамадства на праблемы гэтай моладзі і дапамагчы ёй адчуваць сябе больш упэўнена.**



Першым у сацыяльны цэнтр завітаў музыкант і спявак Зміцер Вайцюшкевіч.

Гэтая сустрэча ўразіла сваёй шчырасцю. Зміцер вольна, па-сяброўску выконваў свае песні — як звычайна. Ён не падбіраў адмысловы рэпертуар, вёў нязмушаную сяброўскую гутарку. А пасля выступу даў майстар-клас ігры на гітары. Маладыя людзі загарэліся, паверылі ў тое, што навучыцца іграць на гэтым даволі складаным інструменце ім будзе пад сілу. А пасля ўсе разам развучвалі ноты. Зміцер тлумачыў, як не толькі чуць гукі, але і дакладна паўтараць іх. І гэта ў некаторых атрымоўвалася даволі добра.

Моладзь, у сваю чаргу, таксама падрыхтавала для госця падарункі. Першым з іх быў грэчаскі танец сіртакі, які яны выканалі, стаўшы ў круг і абняўшыся. Музыканту падаравалі і зробленыя сваімі рукамі цацку, мяккае крэсла, а адна дзяўчына — Даша Васільева — спецыяльна выканала для яго песню. Завяршылася сустрэча сумесным піццём кавы. Для гэтага маладыя людзі загадзя прыгатавалі піроржныя «Бульбачка». Госця папрасілі распісацца на льняных сурвэтках, вышытых каляровымі ніткамі, якія яшчэ доўга змогуць нагадваць пра прыемную сустрэчу. Гэту традыцыю супрацоўнікі цэнтра «падгледзелі» ў тэлеперадачы пра Міхалкова. У лецішчы славутага кінарэжысёра быў абрус, на якім распісваліся ўсе знакамітыя госці. А мадам Канчалоўская вышывала гэтыя аўтографы.

Зміцер Вайцюшкевіч адзначыў, што ніхто не ведае, якое выступленне будзе самым значным у жыцці.

***— Зміцер, вы першым прынялі запрашэнне сустрэцца з маладымі людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Чаму?***

— Таму што прапанова была канкрэтная. Мне дасылаюць розныя запрашэнні. Але яны невядома каму накіраваныя. А тут была канкрэтная размова наконт таго, што ёсць такая ідэя. Я думаю, важна падтрымаць гэту акцыю, даць ёй рэзананс, наколькі гэта магчыма. Я не лічу сябе супервядомым, папулярным. Кожны можа дапамагаць па-свойму, аддаваць, напрыклад, частку добрага настрою гэтым людзям. Я лічу, што не варта неяк адмяжоўвацца ад іх. Мы павінны прымаць удзел. Няхай усё тое, што я напрацаваў за дваццаць гадоў, паспрыяе такой важнай справе, як дапамога людзям, у якіх шмат праблем са здароўем, бытам і г.д.

***— У вас ёсць вопыт зносін з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі?***

— Асабістага няма. Але былі выступы і ў Бараўлянах, і ў дамах састарэлых людзей, дзе таксама шмат людзей абмежаваных, непрацаздольных. Я не лічу, што гэта незвычайная, асаблівая сітуацыя (у тым ліку з пункту гледжання музыкі), што ўсё ім трэба тлумачыць. Я спяваў рознае, выступаў нават у псіхіятрычнай бальніцы. І таксама не бачу розніцы паміж нармальным жыццём і тым, якое прынята лічыць ненармальным.

***— Адмысловы рэпертуар вы не падбіралі?***

— Я ніколі не падбіраю спецыяльныя песні. Што кладзецца на сэрца, тое і гучыць. Музыка і іншыя віды мастацтва павінны ўзрушваць, а не закалыхваць «ой, як прыгожа ўсё». Яны павінны ўводзіць чалавека ў нармальны стан, жыццёвы, у якім ёсць кепскае і добрае, дождж за акном і сонца.

***— Якія адчуванні пасля сённяшняй сустрэчы? Было складана?***

— Не. Класная публіка. І яны ўсе абсалютна розныя. Мне выразна малююцца партрэты кожнага хлопца ці дзяўчыны. Калі браць у адсоткавых адносінах, то беларуская мова тут выкарыстоўваецца часцей, чым у звычайным грамадстве. У гэтым цэнтры два з дзесяці чалавек размаўляюць па-беларуску. І імя «Зміцер» для іх гучыць зусім звыкла.

...Вайцюшкевічу задалі пытанне наконт яго імя. Спявак падрабязна расказаў пра свае сцэнічныя псеўданімы:

— Я выступаю пад двума імёнамі — Зміцер Вайцюшкевіч і Тодар. Спачатку раскажу, адкуль узяўся «Тодар». У гурце «Палац» я працаваў восем год і пачынаў сваю кар'еру. Там мяне любілі называць Федзя — за маю дабрыню, часам мяккацеласць. Таму, калі я пачаў выступаць сольна, вырашыў быць больш цвёрдым (артысту часам гэта вельмі патрэбна) і ўзяў сцэнічны псеўданім Тодар. А з іменем Зміцер таксама звязана асобная гісторыя. Неяк з сябрамі я святкаваў Новы год. Нас было чатырнаццаць чалавек — сем дзяўчат і сем хлопцаў. Дзяўчат звалі па-рознаму: Маша, Каця, Вера... А ўсе хлопцы аказаліся Дзмітрыямі. Я вырашыў, што мне гэта не падыходзіць — трэба неяк выдзяляцца. Таму стаў звацца Зміцерам, па-беларуску. І я супраць таго, каб маё імя перакладалі як «Дзмітрый». Імёны ж замежных артыстаў не перакладаюць. Напрыклад, Адрыяна Чэлентана не называюць у нас Андрэем Чэлентанавым.

Даша Васільева спытала ў Вайцюшкевіча, ці ёсць у яго песні на вершы жанчын. Музыкант адказаў, што ў яго рэпертуары толькі адна такая — песня на верш Ларысы Геніюш. Але з часам ён плануе выпусціць цыкл такіх работ. Дзяўчына прызналася, што сама піша вершы з шаснаццаці гадоў. На што Зміцер, падміргнуўшы, адказаў: «Добра, намёк зразумелы...»

Маладыя людзі шмат атрымалі ад гэтай сустрэчы. Яны сталі больш упэўненымі ў сабе, натхнёнымі на жыццё. А для мяне, журналіста, які большасць часу быў проста староннім назіральнікам, яна таксама не прайшла бясследна. Я пераадолела свой страх зносін з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Я ўбачыла, што рабіць гэта можна проста і нязмушана. Стала ясна: яны не іншыя, не горшыя за нас, ім проста патрэбна больш увагі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Дзённік бландзінкі



### ПРА КУЛЬТУРУ

Сёння пабывала ў даволі вядомым рэкламным агенцтве.

За кубкам кавы гавару з дырэктарам пра сваю прафесію. Ён мілы, прыгожы, разумны, адукаваны. Слухае мяне ўважліва і раптам прызнаецца, што ніколі не чуў ніводнага з названых мной імёнаў. Спрабую пашырыць кола і называю тых, чые імёны на слыху. Нуль! У поўным адчаі згадваю Святлану Алексіевіч. Нуль! Я пачынаю смяяцца. Не з яго, з сябе і сваёй прафесіі. Можа, у мяне і дзіўнае пачуццё гумару, але, пагадзіцеся, смешна займацца вывучэннем творчасці людзей, пра якіх людзі па-за багемным колам нават не чулі... Але дырэктар, натуральна, успрыняў гэты мой вясёлы смех як здзек. «Ведаеце, нехта ніколі не бярэ ежу рукамі... Другі не калупаецца ў вуху запалкай... А ёсць тыя, хто не чытае беларускую літаратуру... Усе розныя!» — гаворыць ён мне з дакорам.

Я ўсё гэта чула неаднойчы. Ці не штодня сустракаю людзей, якія ніколі не бралі ў рукі беларускія кнігі. Дзіўна, што наогул нехта стаў перада мной апраўдвацца за няведанне! Я прывыкла да такіх адносінаў да роднай культуры, даўно не рэагую на гэтыя прызнанні.

Вось адзінае, што мяне яшчэ рэальна раздражняе, калі хто з беларусаў падыходзіць і такім сало-о-одзенькім паблажлівым галаскам зазначае па-руску:

— Я так люблю белорусскую речь!..

### ГІСТОРЫІ, ЯКІЯ НАС ДАГАНЯЮЦЬ

Неяк пісала ў газеце пра агульную яўрэйскую магілу, дзе ляжыць некалькі тысяч чалавек... І вось жыхары горада з нагоды той зацемкі перадалі мне падрабязнасці страшнага даўняга расстрэлу... Дакладней, адну — людзі ведалі, што ідуць на смерць, таму маладыя дзяўчаты ішлі па вуліцы ў вясельных сукенках... У мяне няма падстаў не верыць, але гэта ўсё неяк жахліва кінематаграфічна! Проста нерэальна, і ўсё! Хоць мне і раней даводзілася чуць, што тыя, хто ведаў: карнікі іх вядуць на смерць, апраналі святочную вопратку... Я слухаю гэтыя гісторыі — пра масавыя расстрэлы — час ад часу, і думаю пра тое, што кожная з іх для мяне як фантастычнае апавяданне: часам абсалютна не магу зразумець логіку тагачасных людзей. Вось чым больш слухаю, тым больш разумею адлегласць у поглядах, выхаванні, светаадчуванні...

### КАЗКА ПРА ПАЛКУ

Была ў маім дзяцінстве чароўная кніжка «Індыйскія казкі». Перачытвала яе бясконца, таму да гэтай пары час ад часу пры нагодзе яны, тыя дзіцячыя казкі, мне згадваюцца.

...Жыў-быў у адной вёсцы разумны міравы суддзя. Пра яго казалі, што ён можа вырашыць абсалютна любую справу лёгка і проста. Аднойчы ў селяніна ўкралі грошы, якія ён збіраў на карову. Селянін прыйшоў да суддзі і папрасіў разабраць гэтую справу хутка, але далікатна, каб не пакрыўдзіць аднавяскоўцаў падазрэннямі. Суддзя сказаў: «No problems» і папрасіў прынесці палкі аднолькавай даўжыні ў колькасці, роўнай колькасці аднасяльчан. Калі палкі былі прынесеныя, суддзя сабраў усіх жыхароў і абвясціў:

— Кожны з вас павінен узяць па палцы і аднесці сабе дадому. Той, у каго палка вырасце за ноч на 10 інчаў — злодзей!

На другую раніцу ўсе жыхары сабраліся перад домам суддзі. Ён выйшаў і стаў параўноўваць палкі. Ва ўсіх яны былі роўныя, і толькі ў аднаго палка была... карацейшай на 10 інчаў! Праблема выкрывання злодзея была вырашана проста і далікатна...

Чаму мне казка ўспамінаецца? Ды варта мне толькі згадаць слова «графаман», адразу ж процьма людзей пачынае пісаць лісты і абурацца: «Гэта яна пра мяне напісала!» Кожны падкарочвае палку пад сябе...

### КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ

Схадзіла ажно на дзве выставы. У Музеі сучаснага мастацтва паглядзела выставу Ігара Цішына, які, хоць і вядомы больш як мастак, але цікавы яшчэ і тым, што з'яўляецца тыповым прадстаўніком літаратурнага постмадэрнізму. Яго «Запіскі ў каланіяльным стылі» прымусілі мяне некалі моцна смяяцца. На жаль, тое выданне было абмежавана маленькім накладам і цяпер з'яўляецца рарытэтам. Затое можна паглядзець яго карціны, якія пакуль яшчэ вісяць у адной з самых цікавых сталічных галерэй.

А ў галерэі «Ў» паглядзела выставу «Карціна алеем», якая праходзіла пры падтрымцы кампаніі LIQUI MOLI. У выставе прынялі ўдзел як маладыя мастакі, так і сталыя аўтары. Праект атрымаўся надзіва яскравым... Фатаграфія, відэа, інсталяцыя, арт-аб'екты — усе экспанаваныя творы былі яўна зробленыя не столькі для сябе, колькі для таго, каб уразіць гледача! І гэта атрымалася, дзякуючы творам В. Брусінскага, А. Слабодчыкавай, А. Некрашэвіча, Р. Вашкевіча, А. Лунёва, М. Гуліна, А. Лянкевіча, Г. Школьнікавай.

Адзінае, чаго не хапіла мне на выставе, дык вось гэтых самых «карцін алеем», анансаваных самой назвай выставы... Іншым разам у мяне складаецца ўражанне, што больш за ўсё сучасныя мастакі дбаюць пра сляпых і тых, хто слаба бачыць — карціны цікавей абмацваць, чым глядзець на іх...

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

**ОАО «ЛИДАПИЩЕКОНЦЕНТРАТЫ»**
**(г. Лида, ул. Тавлая, 11)**

**сообщает, что 20 сентября 2010 года в 14.00 в помещении актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11, состоится внеочередное собрание акционеров**

**Повестка дня:**
1. Об увеличении Уставного фонда.
2. О внесении изменений и дополнений в Уставный фонд.

Место проведения собрания: г. Лида, ул. Тавлая, 11.
Время начала проведения собрания — 14.00.
Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционеров — паспорт и доверенность.
УНП 500021268

ОАО «Белсельэлектросетьстрой» сообщает о проведении 17 сентября 2010 года внеочередного общего собрания акционеров.

Повестка дня:
1. О порядке ведения собрания.
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Место проведения: г. Минск, ул. Сухая-3.
Начало в 12 часов.
Начало регистрации в 9 часов.
Тел. для справок: (017) 226 77 39, 203 63 64, 226 66 47.
*Для регистрации на собрании акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров — паспорт и нотариально оформленную доверенность.*
Наблюдательный совет ОАО «Белсельэлектросетьстрой».
УНП 100120777.

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 5 октября 2010 года открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18**

| Сведения о предмете аукциона | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Информация о недвижимом имуществе | | Начальная цена продажи права заключения договора аренды недвижимого имущества, бел. руб. | Срок аренды недвижимого имущества, лет | Сумма задатка, бел. руб. |
| Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | | | |
| Часть первого этажа административно-бытового корпуса, в количестве 13 (тринадцати) помещений, общей площадью 200,81 кв.м. | г. Гомель, ул. Борисенко, 7 | 1 757 088 | 1 | 100 000 |

**Продавец права заключения договора аренды недвижимого имущества:** КПУП «Гомельоблреклама», контактный телефон: 8 0232 74 29 21.

**Шаг аукциона – 5 %. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.**

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18 в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 4 октября 2010 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в КПУП «Гомельоблреклама» подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: юридическим лицом резидентом Республики Беларусь — копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; индивидуальным предпринимателем — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; физическим лицом, — копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона. При подаче документов организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом — документ, удостоверяющий личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Датой поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет организатора аукциона: р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204.**

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством. Победитель аукциона приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договора аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолируемых помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности Гомельской области. Решение Гомельского областного исполнительного комитета 15.05.2010 № 604.

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 89 64, 74 17 34.**



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Галоўны духоўны прыстанак у райцэнтры — праваслаўная царква і Свята-Пакроўскі манастыр, у якім жыве каля трох дзясяткаў манашак, занятых не толькі малітвамі, але і будзёнымі гаспадарчымі справамі. Напрыклад, у абавязку манашак і паслушніц утрыманне і выпас невялікага дойнага статка. Напярэдадні свята крыжы на царкоўных купалах былі падноўленыя і пафарбаваныя ўласнымі намаганнямі. А айцец Уладзімір Козак, калі выконвае гаспадарскія работы, носіць кідкую медыцынскую шапачку — напамін пра супрацоўніцтва з раённай бальніцай, частыя наведванні хворых. Нядаўна святару перадалі захаваную прыхаджанамі старадрукаваную кнігу «Апостал» 1757 года выдання. Айцец Уладзімір лічыць, што гэтая святыня павінна заставацца ў Хойніках часткаю рэлігійна-асветніцкага жыцця, а не пыліцца пад шклом абласных музеяў ці архіваў.

А галоўны хойніцкі музей будзе месціцца цяпер у самым старажытным і ганаровым будынку горада — палацы Прозараў, добра захаваным і як след адрэстаўраваным.

У паштовым аддзяленні сувязі № 2 хойніцкага РВПС працуе сем жанчын-паштальёнаў: Жанна Пінчук, Наталля Паўлючэнка, Галіна Дашук, Ала Любанец, Таццяна Астрэйка, Зінаіда Даленчук і Ніна Мароз. Штодня, як і належыць, яны вязуць лісты і газеты, у тым ліку і нашым шматлікім падпісчыкам. Бясспрэчна, лёс друкаванага слова сёння ў некаторай ступені і ў іхніх руках. Нездарма журналісты-газетчыкі лічаць паштальёнаў сваімі першымі памочнікамі.







# НОВАЯ ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА НА МЕЛЕЖАВАЙ ЗЯМЛІ




## Фотападарожжа па Хойніцкім краі



У бібліятэцы вёскі Вялікі Бор захоўваецца друкавальная машынка, на якой працаваў над сваімі творамі празаік Барыс Сачанка. Экспанат перадала сям'я пісьменніка для стварэння мемарыяльна-літаратурнага пакоя. Бібліятэкар Эма Кузьменка — захавальніца экспанатаў Сачанкі, спадзяецца, што ў будучыні ў Вялікім Бары з'явіцца хата-музей, як на радзіме Івана Мележа ў Глінішчы. Дарэчы, кіруе мележаўскай хатай ягоная стрыечная пляменніца Соф'я Ліпніцкая, якая ніколі не хавае пачуцця гонару быць раднёй славутага майстра слова.

У суседняй з Глінішчам вёсцы Тунеўшчына жывуць адразу дзве майстрыхі — вышывальшчыца Паліна Бенгубенка і ткалля Марыя Ліхач. Раней гэткае майстэрства было звычайнай з'явай у кожнай паляшуцкай хаце, але цяпер майстроў ва ўсім раёне на пальцах адной рукі можна пералічыць. Хто ведае, ці не стануць неўзабаве прадметы жаночага рукадзелля этнаграфічнай рэдкасцю. Сваім вопытам гэтыя жанчыны, на жаль, не дзеляцца — няма з кім.

Некалі ў Хойнікаў была неверагодная перспектыва стаць буйным прамысловым цэнтрам. Быў узведзены нават цэлы мікрараён для працаўнікоў розных прадпрыемстваў. Але знік з карты СССР, а чарнобыльскія праблемы засталіся нявырашанымі, і перспектывы развіцця былі страчаныя. Тым не менш, у новым мікрараёне вырасла паслячарнобыльскае пакаленне... Сёння ў горадзе, як ніколі, назіраецца сапраўдны бэбі-бум. Калі ў гэтай частцы горада возьмуцца за развіццё адпаведнай патрабаванням жыцця інфраструктуры, у Хойнікаў будзе сапраўды малады твар і імклівы рух наперад. Час патрабуе пераменаў, ствараецца новая палеская хроніка.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**











## У Дзень пісьменства запрашаем...

У нядзелю 5 верасня ў 12.00 на галоўнай сцэне каля Хойніцкага райвыканкама адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства. У гэты дзень гасцямі палескай глыбінкі стануць вядомыя асобы літаратуры не толькі Беларусі, але і замежжа.

Шмат цікавага падрыхтавана арганізатарамі для тых, хто вырашыць завітаць на свята. З дзесяці гадзін раніцы пачне сваю работу фестываль кнігі і прэсы. У горадзе майстроў, як заўсёды, будзе магчымасць пазнаёміцца з рознымі рамёствамі, а на дзіцячай пляцоўцы юныя жыхары горада парадуюць сапраўдным канцэртам. У гэты ж час, паміж 13 і 14 гадзінамі, на вуліцы Савецкай адбудзецца цырымонія адкрыцца Дома абрадаў, а ў гарадскім парку — адкрыццё скульптурнай кампазіцыі «Па старонках твораў Івана Мележа».

Газета «Звязда» традыцыйна прымае актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве. І традыцыйна запрашае нашых сяброў, чытачоў і падпісчыкаў да нас у госці ў гарадок прэсы, які размесціцца ў Хойніцкім гарадскім парку. Вас чакае сустрэча з вядучай самай народнай рубрыкі «Алё! Народ на провадзе...» Валянцінай Доўнар, аглядальнікам па Гомельскай вобласці Ірынай Асташкевіч, фотакарэспандэнтам Анатолем Клешчуком і іншымі супрацоўнікамі «Звязды». Рыхтуйце пытанні і прапановы, успамінайце беларускія вершы і песні, бо ў звяздоўскай палатцы вас чакаюць прыемныя гульні, падарункі і пачастункі.

Прыходзьце. Будзем чакаць!

**Таццяна ПРУС.**

## МІНСУВЯЗІ ВЫПУСКАЕ Ў АБАРАЧЭННЕ МАСТАЦКІ КАНВЕРТ, ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА-2010




На марцы змешчана старонка з Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынам, а на канверце — хойніцкая царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

Нагадаем, Дзень беларускага пісьменства сёлета пройдзе 5 верасня ў Хойніках.

Як расказалі карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» ў РУП «Белпошта», у гэты дзень у аддзяленні паштовай сувязі № 2 раённага цэнтра і на месцы выязнога гандлю там жа будзе праводзіцца памятнае гашэнне канверта спецыяльным штэмпелем (аўтар абодвух — сталічны мастак Вера Ягоўдзік).

**Віктар КУШНАРОЎ, «Мінск—Навіны».**

Звяздоўцы шчыра віншуюць сваю былую супрацоўніцу **Галіну Цімафееўну ПАЛЮХОВІЧ з юбілеем** і зычаць здароўя, ціхай сямейнай радасці. Няхай тая цеплыня, з якой вы нязменна ставіцеся да людзей, вяртаецца да Вас штодня, грэе ў любое надвор'е.

# 5 ВЕРШАЎ, ЯКІЯ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ НА ПАМЯЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС

(5 суб'ектыўных меркаванняў)

**АМАЛЬ кожны сучасны дарослы чалавек, відаць, думае, што вучыць вершы — справа школьная. Але не... Вось раней, у часы маладосці нашых бабуль і дзядуляў, кожны абавязкова ведаў які-кольвек вершык (а калі не вершык, дык дакладна песню) на памяць. І мог з гонарам, з любоўю, з цеплынёй гэты вершык да месца прачытаць. Што ўжо казаць пра высакародныя часы розных князёў, графаў ды графінь, калі вершаскладаннем захапляліся нават легкаважныя дочкі якіх-небудзь паважаных бацькоў? Сёння, на першае вока, здаецца, што не тое што вершы перасталі вучыць на памяць, але кніг, наогул, мала чытаюць! Кніг, зрэшты, можа, чытаюць і мала, але вершы ўсё-ткі сёй-той прадстаўнік маладога пакалення вучыць. Школьнікі чытаюць на памяць сваім бацькам вывучаны да ўрока верш, вяртаючы бацькоў, як ні парадаксальна гэта гучыць, да чароўнага свету мастацтва. Бабулі сочаць у перыёдыцы за літаратурнымі экзерсісамі свайго адоранага ўнука ці ўнучкі. Юнак, прачытаўшы ў блогу новастворанны якім-небудзь модным паэтам верш, цытуе яго па памяці ў кампаніі сяброў... «Звязда» папрасіла пяць чалавек, якія займаюцца не толькі літаратурай, выбраць пяць вершаў, якія няблага было б ведаць на памяць кожнаму беларусу.**

### Генадзь ПАШКОЎ, паэт:



**1. «СПАДЧЫНА», Янка Купала.** Тое, пра што пісаў Купала — гэта вечнае. Наша гісторыя і наша Радзіма — гэта наша душа, наша будучыня.

**2. «РАДЗІМА МАЯ ДАРАГАЯ», Алесь Бачыла.** Па сутнасці, гэта наш другі гімн — лірычны, глыбокі, узнёслы, пра Беларусь.

**3. «ЗОРКА ВЕНЕРА», Максім Багдановіч.** Гэты верш мае чыста беларускі характар — светлы з журбінкай. У беларусаў такая ж цнатлівая душа, як цнатлівае пачуццё, пра якое распавядае верш, — улюбёнасць у зямлю, Радзіму, Жанчыну...

**4. «ОЗЕРО ПОДЁРНУТО ТУМАНОМ», Рыгор Сакалоўскі.** Гэты мужчынскі мужны верш напісаны беларускім паэтам-афганцам. Тут афганская вайна і як зборны вобраз вайны (беларусы перажылі шмат болю з-за войнаў!), і як напамін пра саму афганскую вайну. Яна, хоць і не пракацілася па ўсім нашым народзе, але пакінула глыбокі след, і шмат болю і адчаю. Гэты боль у сваёй непаўсюднасці, у сваёй «незаўважнасці», мабыць, нашмат трагічней...

**5. «ЖУРАЎЛІ НА ПАЛЕССЕ ЛЯЦЯЦЬ», Алесь Ставер.** Ціхі добры верш пра прывязанасць да роднай зямлі, пра Радзіму, пра беларускі менталітэт...

### Аляксей ЛЯЛЯЎСКІ, галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек:



**1. «А ХТО ТАМ ІДЗЕ?», Янка Купала.** Гэты верш павінен ведаць кожны беларус. Гэты верш — своеасаблівы беларускі гімн, марш.

**2. «СЫМОН-МУЗЫКА», Якуб Колас.** Няхай кожны сам выбера для сябе ўрывак, які будзе вучыць на памяць. Але гэта вельмі важная для беларусаў паэма. Яна, дарэчы, прысвечана беларускай моладзі. Паэма пра непадобнасць некаторых людзей на іншых. Пра абранасць, пра надзею, пра цнатлівасць і душэўную цеплыню.

**3. «ПА-НАД БЕЛЫМ ПУХАМ ВІШНЯЎ», Максм Багдановіч.** Гэты верш, вельмі лірычны і нацыянальны, мелодыкай і формай вершаскладання звязвае нашу культуру і мову з еўрапейскай, сусветнай. І гэта вельмі важна.

**4. «Я ВАС ЛЮБИЛ», Аляксандр Пушкін.** Мы так цесна звязаныя з Расіяй, што без Пушкіна, ну ніяк не абысціся. Гэты верш вельмі тонкі, самабытны. Самае важнае, што ён прысвечаны самаму галоўнаму ў жыцці пачуццю — каханню, такому ўзнёсламу і неабходнаму нам. Асабліва сёння, таму што час наш — прагматычны: усе размаўляюць толькі пра выгоду. Але жыццё чалавечае складаецца не толькі з матэрыяльных рэчаў, але і з пачуццяў.

**5. «ПАЛОМНІЦТВА ЧАЙЛДА ГАРАЛЬДА», Джордж Гордан Байран.** Гэта паэма пра тое, як ставіцца да жыцця. Мы часам ідзем і не ўсведамляем, што шлях, якім мы крочым, наканаваны менавіта нам. Некаторыя рэчы ў жыцці не падабаюцца, але ўсё гэта дадзена Богам... Паэма адкрывае тое, што кожнае здарэнне ў жыцці мае свой сакральны сэнс, яно даецца чалавеку для нечага. Калі чытаеш паэму Байрана, то спачатку здаецца, што гэта проста жыццярыс. Але назва ж сур'ёзная! Яна надае прыгодам героя іншы, больш глыбокі сэнс. Так і ў жыцці: мы часта не бачым у нейкіх момантах адметнасці, непаўторнасці, але гэта ўсё — «паломніцтва»...

### Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК, паэт:



**1. «СПАДЧЫНА», Янка Купала.** Гімн Радзіме.

**2. «ЗОРКА», Якуб Колас.** Гімн Каханню.

**3. «ПАМІЖ ПЯСКОЎ ЕГІПЕЦКАЙ ЗЯМЛІ», Максім Багдановіч.** Гімн беларускай неўміручасці.

**4. «ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ», Рыгор Барадулін.** Гімн роднай хаце.

**5. «ЛЁН» (прысвячэнне Анатолю Сысу), Эдуард Акулін.** Гімн сяброўству.

### Валерыя (Валярына) КУСТАВА, паэт:

**1. «ПАГОНЯ», Максім Багдановіч.** «Пагоня» для многіх сталася негалосна прынятым патрыятычным гімнам Беларусі, які займеў вядомасць у шырокіх колах дзякуючы музыцы Мікалая Равенскага. Але перш за ўсё гэта верш, які варта ведаць, каб помніць, скуль мы ёсць. І каб памяць нашая была востраю.



**2. «МАГУТНЫ БОЖА», Наталля Арсеньева.** Сапраўдная малітва пра Беларусь. Дарэчы, аўтарская назва твора — менавіта «Малітва». Таксама пакладзены на музыку кампазітарам М. Равенскім, верш для многіх стаўся рэлігійным гімнам Беларусі. Варта прамаўляць яго як мага часцей, каб заставацца беларусам з Богам у душы. «Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай Краіну нашу і наш народ!»

**3. «ЗОРКА ВЕНЕРА», Максім Багдановіч.** Менавіта песенныя вершы-тэксты перш за ўсё людзі і ведаюць. То няхай гэта будуць найлепшыя з іх. Каб быць беларусам, здольным кахаць і казаць пра свае пачуцці — і на зямлі, і вышэй ад зор, — трэба ўмець прызнавацца ў каханні, прызнавацца прыгожа. «Каб хоць на міг уваскрэсла каханне, глянь іншы раз на яе...»

**4. «ЗАЯЦ ВАРЫЦЬ ПІВА», Уладзімір Караткевіч.** Беларусы, апроч таго, што ціхмяныя ды цярплівыя, таксама вельмі гумарныя. І мы не павінны пра гэта забывацца. Караткевіч быў такім самым жыццялюбам, як і яго героі, такім самым неабыякавым да жыцця і сваёй дняпровай Бацькаўшчыны. І да сябе, і да свету ён ставіўся з той доляй гумару ды іроніі, з якой мусіць ставіцца да нястачаў ды перашкодаў кожны мудры чалавек, кожны мудры беларус. «Павінна ж быць і ў зайца радасць перад халоднаю зімой»?.. Верш, вядома, не толькі і не столькі пра зайцаў.

**5. «ВОРАГАМ БЕЛАРУШЧЫНЫ», Янка Купала.** Верш балючы і праўдзівы — пра лёс мовы, самой нацыі. Але між тым у ім нам усім даецца надзея. «І будзе ўнукаў панаванне там, дзе сягоння плача дзед!» Унукі — гэта мы.

### Аксана БЯЗЛЕПКІНА, кандыдат філалагічных навук, выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ:



— Каб не сказаць, што я веру ва ўтылітарную вартасць паэзіі, я скажу, што веру ў яе як ва ўніверсальны сродак перадачы эмоцый, як у малітву. І верш трэба ведаць на памяць не для таго, каб на Новы год чытаць яго перад замілаванымі гасцямі, стоячы на табурэтцы. Яго трэба ведаць, каб тады, калі ад радасці ці болю не хапае слоў, радкі ўсплылі аднекуль і прынеслі палёгку.

**1. «НОВАЯ ЗЯМЛЯ», Якуб Колас.** «Купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут» — гэтыя радкі адгукнуцца ў душы таго, хто марыць быць гаспадаром.

**2. «СПАДЧЫНА», Янка Купала.** А адчуўшы сябе гаспадаром матэрыяльных ці нематэрыяльных каштоўнасцяў, вы будзеце «ўсцяж рабіць агледзіны, ці гэты скарб не збрыў дзе проч, ці трутнем ён не з'едзены». Таму што Родная Старонка, пра якую піша класік, — там, дзе вас штосьці альбо хтосьці трымае.

**3. «ПАХНЕ ЧАБОР», Пятрусь Броўка.** Пра адчуванне шчасця найдакладней скажуць радкі: «Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца. Вось яно — блізкае, яснае шчасце».

**4. «СПЕЛЫ БОР», Анатоль Вялюгін.** Захапленне манументальнай прыгажосцю і магутнасцю прыроды абудзіць у беларусах язычніцкую веру: «З усіх сабораў ёсць сабор, дзе згодзен я маліцца; у спелым леце, спелы бор, звіняць твае званіцы».

**5. «ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ», Рыгор Барадулін.** «Трэба дома бываць не госцем, каб душою не ачарсцвець, каб не страціць святое штосьці», — успомніце вы, калі ўжо нічога нельга будзе вярнуць.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**



Занатоўкі мастака



## ТАТА, МАМА І МЕСЦА СУСТРЭЧЫ

Нядзельнай раніцай ішоў па праспекце Незалежнасці. Нешта-нейкае нібыта мяне штурханула, і я спыніўся на тым месцы, дзе апошні раз выпадкова сустрэў на вуліцы яшчэ жывога, але ўжо смяротна хворага тату. Мінакі праходзілі паўз мяне, а я стаяў ды стаяў, бо ўслупянеў. З'явіўся тата, цяперака ён зусім празрысты і ледзь чутны. Тата-нябожчык сказаў, каб я пастаяў побач з ім яшчэ якую хвіліну. Я спытаў у нябожчыка, як яму там без нас існуецца. Адказаў, што існуе ціха. Удзень, на тым самым месцы, я сустрэў маці. Яна невыказна ўзрадавалася нашай выпадковай сустрэчы, абняла мяне, і я пацалаваў яе ў шчаку.

## СЯМЁН І ПАСЫЛАННЕ

Сустракаючы мяне, першае, што кажа Сямён: «Наша сустрэча невыпадковая! Мне цябе паслаў Бог!» Далей Сямён пачынае пералічваць справы, у якіх яму патрабуецца мая дапамога. Трэба патэлефанаваць Юрыку, трэба арганізаваць сустрэчу з Ігарком, неабходна падштурхнуць справу з Уласам... «Улас — геній! Уласа не забудуць і без Сёмы! Але ў Сёмы, у маленькага Сёмы ёсць абавязак — дапамагчы вялікаму Уласу! Ты дапаможаш мне, я дапамагу яму, і ўсё будзе выдатна, бо цябе да мяне паслаў Бог!» — лапоча Сямён. Яму мяне паслаў Бог, а хто мне на дарогу паслаў балабола Сёму?

## КАСТУСЬ І КНІГІ

«Кастусь, чаму ў кватэры так брудна, пыльна і неприбрана?» — «Я магу зрабіць парадак толькі ў сваіх рукапісах, творах і кнігах». Ён так адказаў, але і ў ягоных кнігах было пыльна і няўтульна, як на чужыне.

## ЮРА І ЖЫВАПІС

«Ты лепіш форму светлаценем?» — спытаў Юра, калі даведаўся, што я зноў займаюся жывапісам. «Я складаю формы з каляровых плоскасцяў і манахромных ліній ды кропак». Юру расчаравалі мае падыходы да карціны, бо ён усё яшчэ любіць вылепленыя мазкамі формы, хоць сам даўно не займаецца жывапісам. Каб крыху суцешыць Юру, я сказаў, што абодва нашы падыходы нельга назваць моднымі.

## ХАДЫКА І СЫХОД

Пераважная большасць вучняў архітэктара Хадыкі так і не зразумела, што, каб застацца паслядоўнікам майстра, абавязкова трэба своечасова пакінуць ягоную майстэрню, ягоную рэстаўрацыйную бастылію. Каб застацца, трэба сысці...

## МІХАСЬ І МАЯ ВАГА

Набыў сабе кітайскія вагі, каб сачыць за сабою. Мо я і не набываў бы, каб не Міхась. Ён мяне напалохаў... Сустрэліся, я кажу: «Кінуў курыць!» — «Малайчына! Правільна зрабіў! Даўно?» — «Пяты месяц пайшоў...» — «Добра выглядаеш!» — «Набіраю вагу. Мне сказалі, што за паўгады я набяру сем-дзесяць кілаграмаў. А мне з гэтымі кілаграмамі нязручна: і там не так, і тут не гэтак, як трэба». — «Дзесяць! А трыццаць не хочаш? Я трыццаць набраў, потым ледзь скінуў, так што сачы за сабою...» Пасля размовы з Міхасём я і набыў вагі, прыйшоў ды ўзважыўся. Дзевяноста, калі ў вопратцы, а без вопраткі — восемдзесят сем. Набраў, бліны-аладкі-кашы-макароны! Набраў сем лішніх кілаграмаў. Сем, праўда, не трыццаць... Але суцяшаць сябе не збіраюся. Я павяду сябе з сабою жорстка, як з чужым чалавекам!

## ЖУК І РАМАН

Празаік Жук кляў перабудову: «Перабудова раскідала мой раман! Каб яна згарэла!». Жуку не спачувалі. З яго пасмейваліся і кпілі. Сапраўды, што ж там за такі раман, які так лёгка разбурыла новая палітычная сітуацыя? Пэўна, раман быў кепскі. Але Жук — пісьменнік, і ён правільна адчуў змены, ён адчуў іх настолькі, што зрабіў учынак — выкінуў напісаны раман. Сам выкінуў! Ніхто з беларускіх літаратараў не выкінуў свае творы, усе працягвалі рабіць выгляд, што свет не змяніўся, што іх творы працягваюць жыць у вечнасці, і толькі Жук выкінуў раман.

## ПАЦЮПА І ДЭТЭКТЫВЫ ШЭЛДАНА

Юрась Пацюпа купляе ў букіністах дэтэктывы. Са стосам танных дэтэктываў Шэлдана Юрась падыходзіць да мяне: «Паслухай, ці добры гэты Шэлдан? Прачытаў адзін том, а набыў сабе восем. А тут думаю... Можа, яны кепскія? Можа, я дарэмна столькі накупіў? Можа, у іх пераклады няякасныя? Ты ж працуеш у структуры, якая выдавала і прадавала гэтага Шэлдана. Што скажаш?» — «Скажу... Які чытач, такі ў яго і Шэлдан!» — «Не, ты мяне не зразумеў... Я пра якасць перакладаў пытаюся. Ці на добрым узроўні пераклады рабіліся?» — «Гэта не я цябе, а ты мяне не хочаш разумець. Усё ў гэтым свеце мае свае адпаведнасці. У гэтым варыянце ўсё сабрана ў гармакнічную кампазіцыю, у правільны ансамбль. І чытач з ягонымі фінансавымі ды разумовымі магчымасцямі, і аўтар з ягонымі здольнасцямі, і перакладчыкі, і сістэма распаўсюду — усё згарманізавана! Які чытач, такая ў ягоных руках і кніга...»

## СЯРОГА І ВЯРТАННЕ

Ён пусціў чутку, што вяртаецца ў Беларусь. Такі заўжды пускае чуткі... Што-што, а чуткі Сярога пускае майстравіта. «Пасля працяглага жыцця на чужыне ён прыняў рашэнне — пераехаць на Радзіму!» І Радзіма мусіць прыняць свайго сына-валацугу. Радзіма павінна шчыра ўзрадавацца... А чаму? З чаго тут радавацца? Валачашчы сабака забяжыць на падворак. Якая ў тым радасць? Усё жыццё Сярога бадзяецца з кватэры на кватэру, з горада ў горад, з краіны ў краіну... Вандруе, як той пустадомак. Жыве пад лозунгам «Табар сыходзіць у неба!» Вандруе і вандруе, шукае цяплейшы куток і саладзейшы кавалак, выступае на чужых пляцоўках, спявае пад чужыя дуды, прыстасоўваецца ды падладжваецца... Хто такога папракне, калі такіх сярод нас большасць пераважная? Я папракну. Бо абрыдлі мне пускальнікі чутак, абрыдлі вяртальнікі і ўцекачы, абрыдлі баязліўцы і прыстасаванцы... З такога чалавека застаецца адзін пшык. Бо не герой, не змагар, не пераможца. Дрэнь, а не чалавек. І лепей было б, каб такі Сярога не вяртаўся ў Беларусь. Але можна і не перажываць за Радзіму, бо такі Сярога пакруціцца тут, пакруціцца, зробіць пакрыўджаны тварык і зноўку некуды з'едзе, кудысьці ўцячэ, каб чуткі пускаць.

## ЖБАНАЎ І ЛІШКІ

Садова-паркавы скульптар Вова Жбанаў еў на праспекце Незалежнасці рэстарацыйны рыс. Мы даўно не бачыліся і зусім даўно не гаварылі. «Як у цябе жыццё? Ты атрымаў ад жыцця тое, што хацеў?» — спытаў у мяне паркава-садовы скульптар. «Валодзя, я атрымаў больш, чым спадзяваўся атрымаць. Таму я цяпер мушу раздаваць лішкі таго атрыманага...» — «Раздаеш?» — «Раздаю!» Я пасядзеў на праспекце разам са скульптарам і папіў вады. Жбанаў піў піва і рабіў выгляд, што верыць у маё шчасце.

**Адам ГЛОБУС.**

Простая мова

# МІЖ ЗЯМЛЁЙ І НЕБАМ

**...Верасень, восень — першыя дні. А людзі апрануты — як у апошнія: гэта значыць, у куртках, шапках, многія ў ботах... Адкуль самотнае — ад спёкі да холаду, ад любові да нянавісці, ад нараджэння да смерці — крок.**

### НАЗІРАННЕ

...Некалі: з кватэрай, з машынай, з дачай? Ого, багаты жаніх!

Цяпер з кватэрай, з машынай, з дачай? Не бедны. І хутчэй за ўсё... стары.

### ПОШУК

Іванавіч — чалавек тутэйшы, як тутэйшы і заклапочаны: прынамсі, павітацца толкам не паспеў, а ўжо «нагрузіў»:

— Слухай, ты можаш мне памагчы. Я жанчыну шукаю...

— ?..

— Не, не для таго, каб яна штосьць мыла-варыла, — я магу гэта і сам... Не для таго, каб на дачы гарбела... Там усё пасаджана і дагледжана, а збіраць ды ўдваіх — гэта ж любата. Я не жмінда, я ўсім падзялюся, так зраблю — мне вядзерца алычы, ёй вядзерца алычы, мне кабачок, ёй кабачок...

— І што, — здзіўляюся, — няма ахвотных?

— Ё, — уздыхае разведзены, — але не тыя, бо я ж хачу, каб яна харошая была, каб разумела, каб паважала, каб з ёй можна было кавы на верандзе папіць, каб пагаварыць — па-беларуску...

Нехта такога чалавека знаходзіць — змоладу і лёгка. Нехта — выхоўвае (цягам жыцця).

Некаму, каб знайсці, яго ж, жыцця, не хапае.

### МУЖЧЫНА — ГЭТА ГУЧЫЦЬ

Аб'ява на слупе: «Девушка с ребенком снимет комнату».

З той жа «оперы» яшчэ адна: «Парень и девушка (семья) снимут квартиру».

Адкуль — парадокс: спачатку — і ці не кожнай «девушке» — проста нясцерп як хочацца стаць жанчынай! А вось стаўшы, прызнавацца ў тым, наадварот, не хочацца.

Ды і не мэтазгодна, бо мала ж, мусіць, ахвотных здаваць жытло «сям'і», якая складаецца з «парня и женщины»?..

Мужчыны ж свае — так было і ёсць! — ствараюць інакш: яны, пакахаўшы, жэняцца.

І потым жывуць, як дыктуе «званне».

### БЫЛА ЛЮБОЎ...

Раніца, тралейбус — у салоне паўзмрок (кіроўцы эканомяць энергію). Значыць, не пачытаеш. І не падумаеш, бо побач — двое дзецюкоў: даўно не бачыліся, відаць, гамоняць.

Гамоняць весела, гамоняць гучна, без аглядкі на іншых.

Што застаецца тым? Слухаць і ведаць, што гэтыя двое ў суседстве раней жылі, сябравалі, што потым адзін з іх пераехаў — у іншы раён: прыватную аднапакаёўку там зняў. Ужо з жонкай. Што яна, тая жонка, па словах мужа, нішто сабе — і як гаспадыня, і як маці (сынку ўжо пяць месяцаў!)... Адна загана — храпе. Дзякаваць Богу, не кожную ноч (толькі тады, як дужа натаміцца), але ж моцна — хоць з хаты ўцякай!

Што муж, як кажа, і рабіў: выносіў у лоджыю надзіманы матрац, сцяліў пасцель, спаў. Кайф. Але гэта — пакуль цёпла было. Цяпер — пахаладала, і ўжо не паспіш. Таму ён паціху перавозіць рэчы — вяртаецца назад, дамоў, да сваіх бацькоў, раз'язджаецца з жонкай, бо «як ты з ёй будзеш жыць?..».

Выходзіць, што ніяк: была любоў — да халадоў...

Што здзіўляе (і не толькі мяне), — думка раз'ехацца (з яшчэ ўчора, трэба разумець, каханай!) прыходзіць хутчэй, чым дапамагчы ёй па гаспадарцы (зрабіць так, каб яна не стамлялася), хутчэй, чым звадзіць яе да доктара, хутчэй, чым уцяпліць лоджыю ці знайсці сям'і іншае жытло.

Навошта ўскладняць? Усе сходзяцца, усе расходзяцца.

### ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ

...Нас знаёмілі, таму я ведаю, што ён — Саша, муж Наташы.

Разам з ім мы едзем у метро, разам з ім выходзім, потым ідзём па вуліцы. Хоць мне і не хацелася б.

Не, не таму, што ён п'яны ці брудна апрануты, не таму, што нешта чаўпе. Хутчэй наадварот — ён высокі, прыгожы, адукаваны, але...

На плячы ў мяне — сумка. Не сказаць, каб цяжкая, але досыць аб'ёмная, і спадарожнік — як мужчына, не ў турме гадаваны, павінен бы яе забраць — паднесці.

Не бярэ — як нічога ніякага чэша поруч.

Мне, мякка кажучы, няёмка (за яго). Перад людзьмі... Яму за сябе — не.

### НЕ МАЁ

Абноўка ў гардэробе — лёгкая светлая куртачка. Кітайцы пашылі — з любоўю, гэта значыць, з кішэнькамі, з замочкамі, з капюшонам. Адзін недахоп — пасак у ёй, як нярodны: увесь час выязджае з хамуцікаў, імкнецца да зямлі.

Што, магчыма, цікава — прыкмячаюць гэта (на вуліцах, на прыпынках, у крамах...) дзясяткі, сотні людзей, бо вакол жа віруе горад. А вось кажуць (што трэба паправіць, бо згубіцца) хіба што адзінкі.

Чужы пасак — чужы клопат.

### НА ФІНІШЫ

У першым шлюбе ёй не пашчасціла — развялася, гады са тры цягнула дзяцей адна. Потым сустрэла яго (нашмат старэйшага і тады жанатага)... Быў вельмі бурны раман!

І гэткі ж скандал, бо жонка яго, ратуючы сям'ю, перабрала ўсё, пачынаючы з парткамаў-райкамаў, завяршаючы біццём шыбаў у хаце разлучніцы...

Муж, аднак, усё роўна сышоў.

І, трэба сказаць, няблага зажыў — працаваў, гадаваў, хай не сваіх, але ж дачок, спраўляў вяселлі, чакаў унукаў... З жонкай. Пакуль яна не захварэла, не злягла, не памерла — зусім маладая.

А ён, стары, жыве. Адзін. У яе кватэры. Жыве пакуль, бо дочкі адкрытым тэкстам сказалі, што ён тут не патрэбен, што «ён ніхто і завуць яго ніяк» — не бацька, не родны...

Родныя дзеці адракліся таксама (і даўно), бо ён калісьці адрокся ад іх.

Фініш...

Пра які, мне здаецца, менш за ўсё схільны думаць тыя, хто заводзіць новыя раманы, «узводзіць» новыя сем'і.

Бурачы старыя.

### ТОЛЬКІ СЛУХАЙ

Субота, рынак. Ён у нас побач, ля дома, што ну вельмі зручна, бо ўсё, што хочаш, там можна купіць. Праўда, калі грошай нямерана, калі ж мерана...

— Тысячу? Ды за што? — трасучы «букетам» пятрушкі шуміць паблізу адна з пакупніц. — Ну, разумею, баклажаны ці памідоры якія, — іх вырасціць трэба. Разумею, бананы, — прывезці чорт ведае скуль. А тут... Пяць лісцікаў... За тысячу. Як жа можна з людзей ды так скуру драць? — пытае яна ў гандляркі.

Гандлярка — лічы, такая ж бабуля — як не дзіўна, маўчыць, не кажа ў адказ нічога.

Ці ўсё ж кажа? Сваім маўчаннем?..

Што не «дралі» б з яе — за лекі, за праезд, за прадукты — не драла б і яна.

### ДАТА

— У-у, колькі зім?..

Гэта — Павел. У ЦУМе. Насустрач.

Зімаў, насамрэч, шмат, «летаў» — таксама, але ўзгадваць іх не час: вяселле ў чалавека, срэбнае, заўтра.

— Гэта 25 гадоў ужо... Сумеснага жыцця? — удакладняю я.

— Не, хутчэй катаргі, — з сумам канстатуе ён, — але ж адзначыць трэба. І во — падарунак жонцы купіць. Дата ж.

### МІЖ ЗЯМЛЁЙ І НЕБАМ

Радкі з ліста: «У 1941-м у нашай вёсцы (адрас паведамляецца) немцы пахавалі не адну сотню сваіх салдат. Кожнага — у асобнай магілцы, кожнага — пад асобным крыжам, з асабістым знакам. Да іх, гэтых нябожчыкаў, прыязджалі потым родныя, каб аплакаць.

Нашых салдат хавалі ў брацкіх магілах. Прычым — штабялямі. Як быццам бракавала зямлі, каб па-людску пахаваць тых, хто яе бараніў, а затым адваёўваў, не хапала часу».

...А мо проста разумення (у бары ж не да сосен?), што чалавек — гэта самае каштоўнае, што ёсць. Між зямлёй і небам.

### З ДРОБНАЙ ДРАБНІЧКІ

Як зранку, так і да астанку: бацька ў Ліды, тады трохгадовай, загінуў на фронце, потым муж сышоў да другой. А сын змоладу захварэў — найгоршай з хвароб (бо не лечыцца): яшчэ летась ён кніжкі з дому выносіў, найлепшы посуд, абутак, адзенне, за капейкі прадаваў, толькі б выпіць. Маці чаго ні рабіла з ім — угаворвала, плакала, біла, прасіла, вазіла і вадзіла па розных дактарах, здабывала лекі, здавала ў ЛПП і, толькі потым, паспрабаваўшы, перабраўшы ўсё, здалася. Больш за тое, прыйшла да высновы, што алкаголікі павінны паміраць (і чым раней, тым лепей), бо яны (у сям'і, у калектыве, у грамадстве...), як гніль у яблыку — пачынаецца з дробнай драбнічкі, а канчаецца...

Слухаць яе было цяжка. І страшна. Бо гаварыла ж маці. Як ні круці, пра сына. Прычым адзінага.

...З паўгода назад ён памёр. Галоўнае — скардзіўся ёй, што, маўляў, нядобра...

Не пачула, адказала, што піць трэба меней, не паклікала дактароў...

Цяпер — плача. Мо таму, што ўспамінае зусім не тое, як ён поўзаў-валяўся па лужынах, як сядзела без скарыначкі хлеба ці як ён прадаў яе паліто, і яна, у маразы, паляцела на працу ў куртачцы — падхапіла запаленне лёгкіх і ледзь не памерла, а ён ні разу не прыйшоў да яе ў бальніцу…

Успамінае, як ён, маленькі, любіў купацца ў ванне, як збіраў «скаварадскіх» жукоў, як на ёлцы ў садку быў каўбоем, як вяла яго (ва ўсім новенькім) у першы клас, як у сёмым ён купіў ёй... духі — за першыя грошы (утаргаваў, здаючы рабіны)...

Неадступныя, светлыя ўспаміны, неадступны і боль: 30 не было, не жаніўся, не жыў!

А што першым памёр, кажа, добра: сама «спарадкавала» — пахавала, як чалавека. Ніхто слова не сказаў.

З апошняга цяпер збірае грошы на помнік. Яшчэ і сабе. Каб потым, калі нехта «спарадкуе» (бо здароўя ўжо ніякага), камусь нагадаць, што таксама жыла.

**Валянціна ДОЎНАР.**

Факт

### ВАДУ ПАДВОЗІЛІ Ў ЦЫСТЭРНАХ

**жыхарам 9 шматкватэрных жылых дамоў і 250 прыватных у Хойніках.**

Як паведамілі ў прэс-службе абласнога ўпраўлення МНС, адбыўся прарыў водаправода халоднай вады, пабудаванага 26 гадоў таму. Тэхнікай КЖУП «Хойніцкі камунальнік» у час, пакуль ліквідавалася аварыя, быў арганізаваны падвоз вады для бытавых патрэбаў. Праз некалькі гадзін аварыйная брыгада абслуговага прадпрыемства ліквідавала аварыю, і водазабеспячэнне было аднаўлена.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «НУМАР» НЕ ПРАЙШОЎ

У бары Сенненскага райпа ноччу пасля яго закрыцця схаваліся два маладыя хлопцы, каб абрабаваць установу. 21-гадовы і 23-гадовы мясцовыя жыхары, беспрацоўныя, спрабавалі скрасці прадукты харчавання на суму больш за мільён рублёў. Але былі затрыманыя на месцы злачынства супрацоўнікамі дэпартаменту «Ахова». Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «Прэміяльныя выплачваюцца на месяц пазней»

**13 жніўня наша чытачка з Пухавіцкага раёна падала заяву на звальненне па ўласным жаданні. Дырэктар школы сказала, што трэба яшчэ адпрацаваць месяц — пакуль не знойдзецца замена. 22 жніўня заяўніца пайшла на бальнічны па 27 чысло ўключна. 28 жніўня выйшла на працу, хоць гэты дзень і быў зроблены выхадным, аддала той «бальнічны». Дырэктар паведаміла, каб прыходзіла ў панядзелак за працоўнай кніжкай. Калі 30 жніўня чытачка атрымала яе на рукі, убачыла дату звальнення па ўласным жаданні — 26 жніўня, г.зн. у дзень, калі яна афіцыйна была на бальнічным. Аднак не гэта прымусіла заяўніцу патэлефанаваць у рэдакцыю (перад гэтым, паводле яе слоў, яна ўжо пракансультавалася ў судзе, звярталася ў органы сацыяльнай абароны).**

— Трэба, каб канчатковы разлік з работнікам праводзіўся ў дзень яго звальнення. Загадчык гаспадаркі, што вядзе табелі, а потым і ў бухгалтэрыі мне сказалі, што пакуль ніякага загаду на выплату няма. Маўляў, будзе загад, будуць і грошы. Было гэта 30 жніўня. Пасля маіх скаргаў ужо ў канцы тыдня патэлефанавалі і сказалі, што магу атрымаць 250 тысяч рублёў. Што гэта за грошы, зразумець не магу. Ці ўваходзіць сюды аплата бальнічнага, а таксама прэміяльныя за правядзенне рамонту ў школе ў жніўні, у якім я ўдзельнічала нароўні з іншымі? — прасіла высветліць чытачка.

**Галоўны бухгалтар аддзела адукацыі Пухавіцкага райвыканкама Тамара СІЛЬЧЫНСКАЯ**, праверыўшы налічэнні, патлумачыла, што нашай заяўніцы за 18 працоўных дзён, тры «бальнічныя» дні (адзін дзень, значыць, без утрымання), а таксама з улікам матэрыяльнай дапамогі за ліпень было налічана 263 769 рублёў. Гэта без прэміяльных за жнівень. З улікам вылікаў (прафсаюзныя ўзносы, у пенсійны фонд) на рукі колішняму работніку павінны выдаць 259 700 рублёў. Ніякіх парушэнняў у налічэннях галоўны бухгалтар не ўбачыла.

— Што ж датычыцца выплаты прэміяльных, дык згодна з калектыўным дагаворам і адзіным палажэннем аб прэміраванні і выплаце стымулюючых надбавак, якія ёсць у кожнай школе, работнікі атрымліваюць іх на месяц пазней, — сказала Тамара Аляксандраўна. І дадала, адказваючы на пытанне: такі парадак у гэтым выпадку зусім не супярэчыць заканадаўству ў частцы канчатковага разліку з работнікам у дзень яго звальнення. — Значыць, за жнівень колішняя работніца атрымае прэміяльныя ў верасні на падставе загада дырэктара школы. Паўплываць на змест гэтага дакумента мы не можам. Аднак, калі, як вы кажаце, заяўніца брала ўдзел у рамонце, яна таксама можа быць прэміраваная.

Напрыканцы размовы галоўны бухгалтар аддзела адукацыі паведаміла, што спецыяльна для гэтага колішняга работніка школы вышэйназваная сума выплаты была знятая наяўнымі і знаходзіцца ў касе. Звычайна работнікам пералічваюць заробак на банкаўскую картку, аднак з улікам тэхнічных момантаў яна змагла б атрымаць іх толькі праз некалькі дзён. Таму ёй і патэлефанавалі, сказалі, што грошы можна атрымаць — у той дзень, калі чытачка звярнулася ў газету...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЦАРКОЎНЫ ЗВОН ЧАСОЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЗНАЙШЛІ Ў КАЛОДЗЕЖЫ Ў ЛЁЗНЕНСКІМ РАЁНЕ

**Звон часоў Вялікага Княства Літоўскага знайшлі ў Лёзненскім раёне, расказалі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле культуры Лёзненскага райвыканкама.**

Пры правядзенні земляных работ у вёсцы Колышкі ў закінутым калодзежы быў знойдзены звон вышынёй 55,6 см і такім жа дыяметрам шырокай часткі. Паводле слоў дырэктара Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея Вольгі Самушчэнкі, нягледзячы на тое, што звон у зямлі праляжаў больш чым паўстагоддзя, стан яго здавальняючы, не хапае толькі языка. Звонку ў верхнім і ніжнім поясе маюцца надпісы на лаціне. Верхні надпіс можна перакласці як «Аднаго Бога славім», а ў ніжняй ёсць імя нейкага Фрыдрыха Квейна і дата 1727, якую спецыялісты лічаць годам вырабу звана. У сярэдняй частцы звана змешчана рэльефная выява Багародзіцы з малым Ісусам.

На думку Вольгі Самушчэнкі, звон трапіў на Лёзненшчыну ў часы ўніяцтва і, хутчэй за ўсё, да сярэдзіны 30-х гадоў XX стагоддзя знаходзіўся на званіцы праваслаўнай царквы. Далейшую гісторыю звана расказваюць мясцовыя жыхары. Адны сцвярджаюць, што яго кінулі ў калодзеж пасля таго, як царкву разбурылі, іншыя запэўніваюць, што пасля разгрому храма звон павесілі на пажарную званіцу, а ў 1941 годзе чырвонаармейцы яго схавалі ў калодзежы, каб каштоўны метал не дастаўся фашысцкім акупантам.

Цікавая і гісторыя знаходжання звана. Адно з Лёзненскіх СВК будуе на сваёй тэрыторыі храм. Каб зэканоміць сродкі, вырашылі не заказваць звон у ліцейшчыкаў, а пашукаць яго ў тым месцы, дзе, паводле слоў старажылаў, мог знаходзіцца старадаўні звон. Месца было названа дакладна — звон знайшлі, але вось работы праводзіліся з парушэннем заканадаўства па ахове культурных каштоўнасцяў, у выніку чаго рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры адмовіла ў выплаце ўзнагароды за знаходку. Звон прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю — прыкладам кавальскага майстэрства.

Цяпер звон, па просьбе вернікаў, перададзены на адказнае захоўванне храму Узвіжання Крыжа Гасподняга ў Лёзне. Пасля рамонту ён, як і належыць, зноў будзе несці сваю службу на званіцы.

**Дыяна КУРЫЛА, БЕЛТА.**

Кватэрнае пытанне

## НЯМА СПАДЧЫНЫ — НЯМА РАЗМОВЫ

**У спадчыну ад бацькоў нам, двум братам і сястры, застаўся дом у вёсцы. Мы вырашылі не прадаваць яго, а выкарыстоўваць як дачу. Прыязджалі, даглядалі зямлю, сад...**

**Шэсць гадоў таму адзін з братоў памёр. У спадчыну на сваю частку дома яго сямейнікі не ўступалі. Цяпер жа ўдава, якая зноў выйшла замуж, патрабуе, каб мы выплацілі ёй кампенсацыю. Ці павінны мы гэта рабіць?**

**Н.С.,** *Мінскі раён.*

Пасля смерці аднаго з саўласнікаў дома, яго доля (калі маёмасць знаходзілася ў долевай уласнасці) становіцца маёмасцю, якая перадаецца ў спадчыну. Гэта маёмасць, калі не было складзена завяшчанне, перадаецца ў спадчыну па законе. Спадчыннікамі першай чаргі з'яўляюцца дзеці, муж (жонка) і бацькі памерлага.

Для атрымання спадчыны жонка памерлага павінна была ў вызначаным парадку яе прыняць, для чаго неабходна было на працягу шасці месяцаў падаць натарыусу па месцы адкрыцця спадчыны заяву аб прыняцці спадчыны або заяву аб выдачы пасведчання аб праве на спадчыну. Як вынікае з пісьма, яна гэтага не зрабіла.

Па заяве спадчынніка, які прапусціў тэрмін для прыняцця спадчыны, суд можа прызнаць яго прыняўшым спадчыну, калі знойдзе прычыны пропуску тэрміну ўважлівымі.

Спадчына можа быць прынята спадчыннікам пасля заканчэння тэрміну, вызначанага для яе прыняцця, і без звароту ў суд, але пры ўмове згоды на гэта ўсіх астатніх спадчыннікаў, якія прынялі спадчыну. Подпісы гэтых спадчыннікаў пад дакументамі, што ўтрымліваюць такую згоду, павінны быць засведчаныя ў вызначаным парадку.

А пакуль спадчына не прынята, для размоў пра выплаты падстаў няма.

**Віктар САВІЦКІ.**

ФОКУС: запрашэнне да палемікі

# Ці ёсць выбар у маладога і перспектыўнага?



Калі я бываю ў багатых заходнееўрапейскіх краінах і, разявіўшы рот, аглядаю тамтэйшыя выдатнасці, заўсёды думаю: ці хацелася б мне застацца тут назаўсёды. Напэўна, такія патаемныя думкі з'яўляюцца ў многіх нашых турыстаў.

Трэба сказаць, што ў свой час мне выпала доля паспытаць эмігранцкага хлеба, які, аднак, давёў мяне да тугі.

Хоць грошай можна было зарабляць больш, чым дома, а прадукты, адзенне і мэбля пры гэтым каштавалі менш, але кавалак мяса пачаў станавіцца ў горле колам. З таго часу я разумею энергетычны сэнс адной вядомай паказкі пра эміграцыю:

*Нармальны працавіты гаспадар раптоўна памёр, на нябёсах яго размеркавалі ў рай. Сядзіць сабе, конікаў слухае, з вавёрачкамі вітаецца, у рацэ ногі мочыць, адпачывае. Тут да яго завітаў чорт:*

*— Мужык, а давай да мяне ў госці, у маё пекла. Пабудзеш і назад вернешся.*

*— Калі на такіх умовах, то давай.*

*А ў пекле — гарэлка ракой ліецца, мужчына ў карты гуляюць, жанчын легкадумных лашчаць. Чорт і кажа:*

*— Калі падабаецца, пішы распіску, і будзеш во так жыць.*

*Спадар спакусіўся і падпісаў чортаў дакумент. Раптам яго скруцілі сямёра чарцянятаў, натаўклі ў бакі і кінулі смажыцца на патэльню.*

*— Чорт, што ж ты мяне падмануў! — узмаліўся чалавек.*

*— А гэта каб табе жыццё ў эміграцыі мёдам не здавалася...*

Вядома, калі ў гэтым жыцці вас нічога больш не цікавіць, апроч як смачна паесці, то вы б на маім месцы за мяжой адчувалі сябе ўтульна.

Раскажу вам толькі, чаму на першы погляд спакуслівыя замежныя даброты надакучваюць людзям майго складу. Ёсць дзве прычыны. Першая — нармальны ў плане развіцця чалавек павінен любіць зямлю, дзе нарадзіўся. Пра гэта ў сваёй культавай прадмове да кнігі «Юдзіф» разважаў Францішак Скарына:

*«Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормленыя, да таго месца вялікую ласку маюць».*

З гэтай жа прычыны, напрыклад, футбольныя заўзятары ў першую чаргу падтрымліваюць нацыянальную зборную СВАЁЙ краіны, а не тую, што гуляе лепш.

Другі нюанс, чаму жыць у эміграцыі нясоладка, сфармаваў адзін мой знаёмы навуковец (сёння жыве ў Нідэрландах).

*— Ведаеш, чаму мне часта хочацца вярнуцца дадому? Таму што за мяжой мы — ніхто. Грошы ёсць, і ў начальства маеш добрую рэпутацыю, а адчуваеш сябе чужым, пігмеем у баскетбольнай дружыне. Але і вяртацца на заробак у 500 тысяч не хочацца...*

Трэба сказаць, што экстрэмальныя адносіны да таленавітай моладзі — гэта наша нацыянальная асаблівасць. Таго ж Францішка Скарыну ў пачатку XVI стагоддзя таксама не зразумелі на Бацькаўшчыне (што за крамолу друкуе гэты чалавек?). Усходняму першадрукару давялося з'язджаць у Прагу, дзе ён не толькі займаўся друкарскай дзейнасцю, але і заснаваў Каралеўскі батанічны сад неверагоднай прыгажосці. Ці, напрыклад, лёс нацыянальнага героя Чылі Ігната Дамейкі. Нарадзіўся ён у нашым сучасным Карэліцкім раёне, а на роднай зямлі аказаўся дысідэнтам, «філаматам». І ў выніку вымушаны быў падымаць да сусветнага ўзроўню чылійскую навуку.

Прыкладаў падобных я магу прывесці стольк, што не хопіць газетнай паласы.

Чаму я вырашыў закрануць гэтую балючую і непапулярную тэму на старонках «Звязды»?

Сёння, нават калі ты самы апошні іншадумца, цябе не стануць за гэта спальваць на вогнішчы і адразаць язык. З іншага боку, нават калі «маладыя і перспектыўныя» ўсім сэрцам мараць дапамагчы сваёй краіне, то дагэтуль часта сустракаюцца з непрабівальнай бюракратыяй. Гэта калі ўсё на словах магчыма, але ажыццявіць ідэі больш складана, чым збудаваць копію Вялікай Кітайскай сцяны.

Новых яркіх імёнаў, на мой асабісты погляд, не з'яўляецца ні ў літаратуры, ні ў музыцы, ні ў грамадскім жыцці (прынамсі, я як журналіст штодня за гэтым сачу і раблю такія высновы). Нават у навуцы за апошнія гады амаль не з'явілася яркіх асобаў (хоць наш узровень адукацыі, прынамсі па тэхнічных навуках, высокі). Ці азначае гэта, што такіх не нараджаецца? Што вы, пабойцеся Бога, як на беларускай зямлі можа не з'яўляцца геніяў!!!

Адзін мой сябар, вельмі моцны паэт, вымушаны выдаваць кніжкі за ўласныя грошы. А заробатная плата — невялікая, і карміцца трэба. І гэта для яго замкнёнае кола. У выніку нашы маладыя літаратары едуць у Кіеў ці Маскву, іх друкуюць там. І, верагодна, потым будуць называць расійскімі і ўкраінскімі пісьменнікамі і паэтамі.

Тое ж самае з музыкай. Не ведаю, хто ў нас адказны за развіццё, скажам, эстрады, але яна, вобразна прамаўляючы, у першабытным стане. Новых яркіх артыстаў не відаць, затое прадпрымальныя расійскія прадзюсары знаходзяць у нас перспектыўных музыкаў і вязуць матросіць да сябе. Усё аўтэнтычнае пры гэтым з нашага чалавека хутка і незваротна выбіваецца.

Ну, а з навукай і ўцечкай мазгоў гэта старая прыпавесць. Праблема таксама пакуль поўнасцю не вырашана. Чаму?

Усё проста — маладым і перспектыўным часта проста няма куды пайсці, каб пра сябе заявіць. Куды ні звярніся — як з вадою біцца.

Скажам, я адчуваю ў сабе моцныя здольнасці спевака і хачу запісаць альбом. Куды звярнуцца, каб дапамаглі і пры гэтым не зацкавалі? Да артыстаў з тэлевізара, якія гучаць, як спевы з прабабулінага патэфона? Я спрабаваў, але плёну гэта не прынесла. На большасці радыёстанцый сказалі: «У нас беларускамоўнае — нефармат».

Ці, напрыклад, я хачу адчыніць модную кавярню ў сваім раёне. Ці знойдзецца ў райвыканкаме чалавек, які ахвотна патлумачыць усе нюансы і дабрадушна, па-бацькоўску, навучыць, як распачаць свой бізнэс? Мой былы аднакласнік нядаўна спрабаваў адчыніць краму па продажы бройлерных курак, але так заблытаўся ў дакументацыі і справаздачах, што вырашыў — лепш не звязвацца. І з'ехаў працаваць у Маскву.

Хацелася б канкрэтна ведаць, дзе знаходзяцца людзі, што павінны дапамагаць маладым і ахвочым талентам? І чаму яны сядзяць, як цеста ў дзяжы, і іх дзейнасці не відаць?

Іначай фарміраваць у Беларусі моцны інтэлектуальны рынак мы будзем яшчэ паўстагоддзя. А маладыя таленты будуць па-ранейшаму шукаць росту далёка ад роднага дома.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

Захапленні

# З'ЯВІЛІСЯ ПРАЎДЗІВЫЯ — ГРЫБНЫ СЕЗОН АДКРЫЎСЯ

**На рынку лісічак шмат, а яшчэ прайшла чутка, што прадпрымальнікі чакаюць грыбнікоў на выхадзе з лесу. Чаму б не праверыць.**



Апоўдні быў ужо на вакзале і зазірнуў у прыёмны пункт. Каля тэлевізара толькі прыёмшчыца, у пластыкавых скрынках лісічкі ляжаць.

Праз паўтары гадзіны я ўжо ў Іўной пад Слонімам. Выйшаў з дызеля адзін, бо ў гэты час хто за грыбамі ездзіць. У мяне ў запасе толькі дзве гадзіны. Аказалася, што 2 верасня цягнік у сувязі з рамонтам чыгункі да Гародні не ідзе — канцавы прыпынак Зэльва. Вось і вяртацца назад не а 18 гадзіне, а 16-ай. Так што дужа не разгуляешся.

Яшчэ ў вагоне ўспомніў, што забыўся компас, і гэта крыху сапсавала настрой. У вялікім лесе без компаса гаспадаром сябе не будзеш адчуваць.

Адразу пачалі трапляцца лісічкі, сыраежкі — найпершая прыкмета, што грыбы ёсць. Іншая справа — якія?

Зялёны лес — жывы. Нават дзіўна крыху: стаяла такая спёка, а лес перанёс яе лёгка. Магчыма, звязана гэта з тым, што хоць і зрэдку, а навальніцы грымелі, былі і дажджы.

Неўзабаве натрапіў на праўдзівага — першага ў гэтым годзе. На Ляхаўшчыне некалі баравікоў, ці белых, не ведалі — называлі іх «праўдзівымі» ці «праўдзівікамі». «Прынесла кош праўдзівікаў», — казала бабуля. Або: «Праўдзівымі зямля ўсыпана». Пацікавіўся і аказалася, што так называлі баравікі і пад Нясвіжам. А цікава, як у іншых рэгіёнах Беларусі? Дужа ёмкая назва. Праўдзівы грыб — значыць, сапраўдны.



Каб дайсці да аддаленых грыбных мясцінаў, трэба было дыбаць яшчэ кіламетры тры, а часу ўжо няма.

Пайшоў дождж — не грыбны, дробны, а буйны, халодны.

Спачатку, каб не заблукаць, трымаўся лясной дарогі. А потым захапіўся «ціхім паляваннем»: у ельніку нагнуўся над адной купкай лісічак, натрапіў на другую і раптам зразумеў: не ведаю, у які бок ісці. Калі спазнюся на дызель, то начаваць давядзецца ў лесе. Чыгунка дзесьці на поўначы. Чырвоная стрэлка компаса мяне выводзіла, ды і ў сонечны дзень прасцей было. Пачаў успамінаць, як у школе вучылі. З паўночнага боку на дрэвах меней галін, а камяні больш парослыя мохам. Уважліва прыгледзеўся, і неўзабаве выйшаў на знаёмую лясную дарогу.

Надвор'е канчаткова сапсавалася, бо дождж набраў сілу, а на мне накідка з плёнкі — кароткая і калені не прыкрывае. Добра, што хоць апрануўся цёпла.

На прыпынку, пад навесам тулілася чалавек пяць. Асабліва пакутавалі ад холаду двое мужчын, якія былі няголеныя і лёгка апранутыя.

Бліжэй да прыходу дызеля яшчэ падышлі грыбнікі. У самых удачлівых было па 10-літровым вядры лісічак. Асобна, як вялікі гонар, трымалі праўдзівыя. Адна жанчына пахвалілася, што сёння знайшла 14, а ўчора дваццаць «праўдзівікаў». Разам з тым, я даведаўся, што адзін грыбнік здаў 11 кг лісічак. Каб столькі сабраць за дзень грыбоў, трэба быць увішным. Прадпрымальнікі за кілаграм лісічак плацяць 5 тысяч рублёў, а ў горадзе гэтых прыгажунь прымаюць на 500 рублёў даражэй. За баравікі даюць 8 тысяч за кілаграм. Аказваецца, некаторыя аматары «ціхага палявання» ездзяць у грыбы штодня і маюць невялікі заробак.

Калі выйшлі з цягніка ў горадзе, то большасць грыбнікоў падалася да прыёмнага пункта, а я са сваім невялікім уловам — на аўтобусны прыпынак.

Паўтара кілаграма лісічак, восем праўдзівых, тры бабкі ды некалькі махавікоў паклаў на стол перад жонкай.

— У суботу едзем у грыбы. Праўдзівыя пайшлі.

— А хто бульбу капаць будзе?

— У зямлі не прападзе. Ды і бульбы той палова соткі. А грыбы...

— На выхадныя абяцаюць сонца, а там зноў дажджы. І калі ты гэтых грыбоў наясіся? — падціснула губу жонка.

А наперадзе ноч, дзень і яшчэ адна ноч. І я думаю, што да кансенсусу мы прыйдзем. Паедзем у грыбы, бо і пра душу трэба думаць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# НАЙБОЛЬШ АДЧУВАЛЬНЫЯ ДА ПЕРАМЕНЫ НАДВОР'Я — ГІПЕРТОНІКІ

Паводле статыстыкі, у 40 працэнтаў людзей восенню назіраюцца прыкметы дэпрэсіі. І гэта невыпадкова. Парушэнне сезонных біялагічных рытмаў, рэзкае зніжэнне сонечнай актыўнасці робяць чалавека больш уразлівым да развіцця дэпрэсіі і іншых псіхічных расстройстваў і прыводзяць да абвастрэння хранічных хвароб.

Прыродныя з'явы прымушаюць пакутаваць мільёны людзей на планеце. Да перамены надвор'я адчувальны кожны трэці: метэазалежныя людзі на магнітныя буры і перапады атмасфернага ціску рэагуюць асабліва востра. Адразу змяняецца эмацыйны фон (упадак сілаў, пагаршэнне памяці, раздражняльнасць, беспадстаўная трывога), з'яўляюцца цёмныя кругі пад вачыма і галаўны боль, які ў асобных выпадках суправаджаецца насавым крывацёкам, нярэдка турбуюць цягнучыя болі ў мышцах, ламата ў суставах, сухасць у роце.

На шчасце, метэаадчувальнасць — з'ява непастаянная. Яна ўзмацняецца ў залежнасці ад таго, наколькі слабы арганізм, інакш кажучы, якія і ў якой форме (цяжкай ці лёгкай ) хранічныя хваробы мае чалавек. Сама па сабе яна бяспечная, але калі ў адказ на атмасферныя з'явы абвастраюцца хранічныя хваробы, з'яўляюцца нечаканыя збоі ў рабоце сардэчна-сасудзістай, стрававальнай, дыхальнай сістэмах, то гэта ўжо сур'ёзна.

Ёсць тры стадыі метэаадчувальнасці: лёгкая — слабасць і санлівасць, сярэдняя — скачкі ціску і парушэнне сардэчнага рытму, цяжкая — болі ў галаве, сэрцы, задышка і нервовыя расстройствы.

Найбольш адчувальныя да перамены надвор'я людзі з хранічнымі захворваннямі, асабліва сардэчна-сасудзістай сістэмы — гіпертонікі, тыя, хто мае ішэмічную хваробу сэрца, стэнакардыю, сардэчную недастатковасць, перанеслі інфаркт. У іх галаўны боль і боль у суставах, слабасць, прыступы стэнакардыі можа правакаваць нават змяненне напрамку ветру. Але часцей за ўсё пагаршаецца самаадчуванне пры рэзкіх перападах тэмпературы і атмасфернага ціску.

Чаму ад капрызаў надвор'я больш за ўсё церпяць сардэчнікі? Таму што менавіта крывяносныя сасуды прымаюць на сябе галоўны метэаўдар. Калі атмасферны ціск паніжаецца, а тэмпература паветра павялічваецца, урачы раяць сардэчнікам больш бываць на свежым паветры, рабіць дыхальную гімнастыку, піць настойку кораня жэньшэня, лімонніка, полівітаміны.

Калі ж атмасферны ціск павышаецца, а тэмпература, наадварот, паніжаецца, то людзям з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы рэкамендуецца масаж шыйна-плечавога пояса, гарчычнікі на вобласць патыліцы і нажныя гарачыя ванны. Можна таксама прымаць настойку валяр'яны, сардэчніку, рэланіум або спазматычныя сродкі — лапазол, дыбазол, но-шпу, папаверын. Зразумела, калі няма супрацьпаказанняў да іх прымянення. А калі звычайная доза лекавых прэпаратаў не дапамагае, варта параіцца з урачом і перагледзець дазіроўку з папраўкай на метэаўмовы.

Змены надвор'я не могуць стаць прычынай хваробы, яны толькі пагаршаюць праявы немачы, якую чалавек ужо мае. А на стан людзей з моцным здароўем надвор'е амаль не ўплывае: у іх перапады тэмпературы і атмасфернага ціску суправаджаюцца хуткімі змяненнямі выпрацоўкі гармонаў, утрымання трамбацытаў у крыві, актыўнасці ферментаў. Гэтыя змяненні — своеасаблівая абарончая рэакцыя арганізма на неспрыяльныя ўмовы.

Можа падацца, што метэапатычныя рэакцыі — спрадвечны спадарожнік людзей. Але гэта не зусім так. Спецыялісты лічаць, што ад метэазалежнасці можна калі не пазбавіцца, то значна яе знізіць.

Людзі з рознымі захворваннямі па-свойму рэагуюць на розныя фактары надвор'я. Для сардэчнікаў і астматыкаў небяспечным з'яўляецца нізкае ўтрыманне кіслароду ў паветры. У гэтыя дні, як паказваюць шматгадовыя назіранні «хуткай», у тры разы павялічваецца колькасць выклікаў ад такіх хворых. Яны таксама хваравіта рэагуюць на рэзкае пахаладанне.

Гіпертонікаў і гіпатонікаў турбуюць рэзкія перапады атмасфернага ціску. Гіпертонікі таксама горш пераносяць бязветранае надвор'е.

Людзі з захворваннямі суставаў, апорна-рухальнага апарату, з хранічнымі бранхітамі, як правіла, дрэнна пераносяць вялікую вільготнасць.

Абвастрэнне псіхічных захворванняў прыходзіцца на вельмі ветраныя дні. Маленькія дзеці асабліва неспакойна паводзяць сябе ў дажджлівыя дні. Тыя, у каго ёсць хваробы шчытападобнай залозы, звычайна дрэнна адчуваюць сябе, калі на вуліцы туман.

Рэзкае пападанне з холаду ў цяпло можа выклікаць абвастрэнне хранічных інфекцый, а ўстойлівае пахаладанне, наадварот, прытармозіць вострыя запаленні і павысіць імунітэт.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

**АКРАМЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ПАРАДЫ «ВЕСЦІ ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ» МЕТЭАПАТАМ РЭКАМЕНДУЕЦЦА:**

- **кожную раніцу пачынаць з лёгкай гімнастыкі і душа;**
- **традыцыйны чай замяніць адварамі ліпы, медуніцы, святаянніку, мяты;**
- **аддаваць перавагу прадуктам з высокім утрыманнем калію: разынкам, абрыкосам, куразе, бананам, бульбе (запечанай або ў «мундзірах»);**
- **прымаць вітамін Е, які ўтрымліваецца ў зерневых прадуктах і арэхах;**
- **прывучаць сябе спакойна рэагаваць на крытычныя сітуацыі;**
- **штодзённа праводзіць расслабляльны масаж вобласці шыйнага аддзела пазваночніка і лапатак. Гэта можна рабіць і самастойна: абедзвюма рукамі пагладжвайце скуру па напрамку ад шыі да плячэй на працягу 10-15 хвілін;**
- **прымаць заспакаяльныя сродкі (настойкі глогу, валяр'яну, сардэчніку), калі заўважыце, што часта раздражняецеся па дробязях;**
- **абмежаваць колькасць ласункаў, тлустай, смажанай і вострай ежы (пры ўздзеянні магнітных палёў на арганізм ён пачынае горш засвойваць вугляводы, а нізкая тэмпература паветра прыводзіць да павышанага ўтварэння свабодных радыкалаў, якія парушаюць дзейнасць клетачных мембран);**
- **абавязкова ўвесці ў харчовы рацыён рыбу, фасолю, сачавіцу, гарох, грэчку, капусту, рэпчатую цыбулю, яблыкі і моркву;**
- **з прафілактычнай мэтай выпіваць па 1/2 шклянкі настою рамонку за 30 хвілін да яды 2-3 разы на дзень і шклянку адвару шыпшыны — за гадзіну да сну.**

## ХРАНІЧНУЮ СТОМЛЕНАСЦЬ "ЗАПУСКАЮЦЬ" ВІРУСЫ?

Амерыканскія навукоўцы атрымалі новыя доказы віруснай прыроды сіндрому хранічнай стомленасці (СХС).

Трэба патлумачыць, што сіндром хранічнай стомленасці з'яўляецца расстройствам незразумелай прыроды, якое суправаджаецца моцнай псіхалагічнай і фізічнай стомленасцю, болямі ў мышцах і суставах, а таксама дэпрэсіяй. Па прыблізных ацэнках, ад СХС церпяць каля мільёна жыхароў ЗША, пры гэтым 80 працэнтаў усіх выпадкаў захворвання застаюцца невыяўленымі. Нацыянальная служба аховы здароўя Вялікабрытаніі ацэньвае колькасць хворых СХС у краіне ў 250 тысяч чалавек. Амерыканскія даследчыкі правялі генетычны аналіз узораў крыві 37 пацыентаў з сіндромам хранічнай стомленасці і 44 здаровых добраахвотнікаў. Па выніках аналізу, генетычныя ланцужкі, характэрныя для вірусу, звязанага з вірусам лейкозу мышэй, былі выяўленыя ў 32 хворых, што складае каля 86,5 працэнта ад агульнай іх колькасці. Акрамя таго, праз 15 гадоў пасля пачатку даследавання вучоныя правялі паўторны аналіз у васьмі ўдзельнікаў, у крыві якіх былі выяўлены гены. Аналіз паказаў прысутнасць вірусных генаў у крыві сямі з васьмі ўдзельнікаў другога этапа даследавання. Трэба дадаць, што раней вынікі даследаванняў навукоўцаў у ЗША і Вялікабрытаніі давалі супрацьлеглыя вынікі...

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЗЛАЯКАСНАЯ ПУХЛІНА — 23 КІЛАГРАМЫ

Мяркуецца, што гэта самае вялікае злаякаснае новаўтварэнне, зафіксаванае ў медыцынскай літаратуры.

54-гадовая жанчына з прыгарада Буэнас-Айрэса, імя якой не называецца, паступіла ў бальніцу Гандулфо са скаргамі на значнае павелічэнне жывата ў памерах, якое ўскладняла нахілы і хаду. Матка з пухлінай была такога памеру, як калі б жанчына была цяжарная пяцярнёй.

Пацыентка, якая пахудзела падчас лячэння на 35 кілаграмаў, была выпісана дадому праз пяць дзён пасля хірургічнага ўмяшання.



## Заўсёды каля мамы

Слінгі сталі часткай жыцця многіх маладых бацькоў — згадзіцеся, вельмі зручна, калі малы заўсёды побач з вамі, і вялікай калыскі для перамяшчэння ўжо не трэба. Менавіта таму слінгамода прыйшла да нас у Беларусь. Слінгамамы і слінгататы запрашаюцца на «Слінгафестываль», які пройдзе 11 верасня, калі сталіца будзе адзначаць свой дзень нараджэння. На фестывалі можна будзе паназіраць за шэсцем слінгасем'яў, паглядзець дэманстрацыі моды, а таксама паўдзельнічаць у конкурсах і атрымаць падарункі.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**




**Вось дык надакучылі мы матухне-зямлі! Не ведае яна, як ад нас пазбавіцца. Усё нам мала — свідравіны робім, нафту выпампоўваем, у акіян яе выліваем, лясы высякаем — вось і кідае нас са спякоты ў холад. Гэта ж трэба, каб у пачатку верасня ў паліто і ботах ужо хадзілі. Ну і ў сувязі з халадамі будзем грэць сябе знутры гарачай хатняй ежай (гэта я так плаўна падвяла да сваіх «пампушак»). Па-першае, будзем пабольш запякаць у духоўцы (гэта каб кватэры-дамы праграваць). Па-другое, разумныя людзі раяць разнастаіць смакавыя адчуванні рознымі заправамі. Так што часцей выкарыстоўвайце востры перац, імбір, часнок. Стравы з вострымі прыправамі саграваюць і «абуджаюць» страўнік. Прыправы наогул вельмі карысныя. Перац выкарыстоўваюць для прафілактыкі анказахворванняў. Часнок супрацьстаіць вірусам. Імбір стымулюе страваванне і выводзіць таксіны. Таму не мерзніце, дарагія мае кулінары!**

### БУЛЬБЯНАЯ КАЎБАСА

*Рэцэпт вычытала ў інтэрнэце і вырашыла паспрабаваць. Каўбаса атрымалася — цуд. Я думала, што атрымаецца штосьці накшталт бульбяной запяканкі, але атрымалася страва цалкам адмысловага смаку. Вельмі сакавітая і духмяная.*

***Вазьміце**: 800 г бульбы, 2 сярэднія цыбуліны, 1 яйка, 2 чайныя лыжкі манкі, 100 г сала, 2 зубкі часнаку, соль, чорны перац, пры жаданні — 1 чайную лыжку молатага салодкага перцу.*

Падмарожанае сала парэзаць маленькімі кубікамі з бокам 0,5 см. Змяшаць з 1/6 чайнай лыжкі солі, чорным перцам і адным зубком часнаку, праціснутым праз прэс. Цыбулю вельмі дробна парэзаць і на маленькім агні на алеі смажыць, пакуль зарумяніцца. Бульбу абабраць і надзерці на сярэдняй тарцы (я заленавалася і ўзяла буйную, у выніку чаго каўбаса атрымалася занадта рассыпістая, яе было цяжка перакладаць у талерачкі). Сок старанна адціснуць. Змяшаць бульбу, сала, цыбулю, яйка і манку. Масу пасаліць (дзесьці 0,5 чайнай лыжкі солі) і паперчыць. Пры жаданні для смаку і колеру можна дадаць молаты салодкі перац (або папрыку). Масу выкласці ў пакет або рукаў для запякання. Калі такіх спецыяльных абалонак няма, то можна выкарыстаць паперу для выпечкі, загарнуўшы ў яе бульбяную масу. Размеркаваць масу ўнутры мяшка ў выглядзе цыліндра. Канец мяшка закруціць вакол атрыманай каўбасы. Для таго, каб каўбаса захавала форму пры запяканні, абвязаць яе баваўнянымі ніткамі. Іголкай зрабіць у пакеце шмат праколаў. Выкласці каўбасу на бляху і выпякаць у духоўцы пры тэмпературы 200-220°С 40—60 хвілін. Бляху з гатовай каўбасой выняць з духоўкі і даць пастаяць пры пакаёвай тэмпературы прыкладна 10 хвілін. Ніткі зняць, пакет разрэзаць і акуратна зняць з каўбасы. Падаваць каўбасу ў гарачым або цёплым выглядзе.

### БАКЛАЖАНАВЫ ПАШТЭТ З ЯЙКАМІ

*Вельмі смачны паштэт. З ашаламляльным водарам. Далікатны, але не размазня. Цалкам можна падаць і на святочны стол.*

***На 4 бутэрброды нам спатрэбіцца:** 2 баклажаны (400—500 г), 2 цыбуліны, 2 вараныя яйкі, 1 маленькі зубок часнаку, 3 сталовыя лыжкі алею, зяленіва, соль.*

Баклажаны ачысціць ад лупіны, разрэзаць уздоўж напалову, змазаць алеем і запячы ў духоўцы пры тэмпературы 200-220°С да мяккасці (гатоўнасць правяраць нажом). Цыбулю парэзаць адвольна і абсмажыць на алеі да мяккасці і лёгкай залацістасці. Прапусціць праз мясарубку астылыя баклажаны і цыбулю. Яйкі нядробна пасекчы. Часнок прапусціць праз прэс. Змяшаць баклажанавую масу з яйкамі і часнаком. Уліць алей, які застаўся пасля смажання цыбулі. Пасаліць на смак і пры жаданні дадаць здробненае зяленіва.

### АЛАДКІ З ГАРБУЗА

***Вазьміце:** 500 г гарбуза, 1,5—2 шклянкі мукі, 1 шклянку малака, 2 яйкі, 1 сталовую лыжку цукру.*

Гарбуз ачысціць ад лупіны і семачак. Затым надзерці гарбуз на тарцы. У атрыманую масу дадаць малако, муку і соль. Атрыманую масу добра вымешаць і выпякаць на патэльні.

### ПУДЫНГ З ГАРБУЗА З ЯБЛЫКАМІ

***Нам спатрэбіцца:** 300 г ачышчанага гарбуза, 1 яйка, 100 г ачышчаных яблыкаў, 10 г сметанковага масла, 10 г цукру, 50 мл малака, 30 г манных крупаў, смятана для змазкі, цэдра і соль — на смак.*

Нарэжце ачышчаны гарбуз скібачкамі, заліце малаком і давядзіце пад накрыўкай да гатоўнасці, засыпце манныя крупы і працягвайце варыць 8—10 хвілін. Здыміце з агню, дадайце дробна нашаткаваныя яблыкі, цукар, лімонную цэдру, соль і яечны жаўток, добра змяшайце. Бялок узбіце да густой пены, увядзіце ў атрыманую масу, асцярожна вымесіце, выкладзыіце на патэльню, змазаную алеем, зверху змажце смятанай і запякайце ў духоўцы да гатоўнасці.

### МЯСА Ў ФОЛЬЗЕ З АПЕЛЬСІНАВЫМ СОКАМ

***Вазьміце:** 800 г—1 кг мякаці свініны, 2 чырвоныя апельсіны, 1 чайную лыжку мёду, 2/3 чайнай лыжкі солі, перац.*

З апельсінаў выціснуць сок (павінна атрымацца прыкладна 200 мл). Для таго каб сок лепш выціскаўся, цытрусавыя трэба падаграваць, напрыклад, у гарачай вадзе. У сок пакласці мёд, перац і соль. Размяшаць да растварэння. На стол крыж-накрыж выкласці доўгія адрэзы фольгі. На сярэдзіну пакласці чвэртачку лупіны апельсіна — афарбаванай часткай уверх. На лупіну выкласці кавалак мяса. Падняць канцы фольгі ўверх, абхопліваючы мяса. У пакінутую адтуліну, прама на мяса, уліць апельсінавы сок. Замацаваць канцы фольгі над мясам. Пакласці атрыманы скрутак на паддон і выпякаць у духоўцы пры тэмпературы 220° С да гатоўнасці прыкладна 1,5 гадзіны. Гатовае мяса дастаць з духоўкі, але з фольгі не вымаць да падачы на стол.

Цяпер гатуем соус. Фольгу асцярожна адагнуць і праз адтуліну, якая ўтварылася, зліць сок. Фольгу зноў закрыць. Сок пакаштаваць. Калі ён моцна перасолены, то развесці вяршкамі. Калі смак прыемны, то вяршкі дадаваць не трэба. Вымераць атрыманы аб'ём вадкасці. На кожныя 100 мл узяць 1 сталовую лыжку мукі. Насыпаць муку ў маленькую каструльку і трымаць на вялікім агні да з'яўлення лёгкага карычневага адцення. Пры інтэнсіўным памешванні ўліць тонкім струменьчыкам вадкасць. Варыць на невялікім агні пры памешванні, пакуль загусцее. Калі пры ўвядзенні вадкасці ўсё ж утварыліся камякі, то працадзіць гатовы соус праз дробнае сітца. Мяса атрымліваецца надзвычай смачнае. З тонкім цытрусавым водарам, кіславата-салёнае, мяккае і далікатнае.

### ЯДОМЫ АНЕКДОТ

*Добрыя парады:*

*Калі вашы дзеці выраслі, манную кашу можна прыгатаваць ім на піве.*

***

*Не адкладвай на заўтра тое, што пратухла яшчэ заўчора...*

***

*Купіце 10 пачак чыпсаў і збярыце бульбіну!*

***

*Маска для твару.*

*Бярэцца квашаная капуста. Выкладваецца на талерку.*

*Паліваецца посным маслам. Капустачка з'ядаецца пад чарачку гарэлкі...*

*Твар задаволена ўсміхаецца і свяжэе.*

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
____________А.Л.Гальперин
02.09.2010

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием акционеров
ЗАО «ЭРИА»
«18» августа 2010 г.
Протокол № 4/2010

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## об открытой продаже жилищных облигаций закрытого акционерного общества «ЭРИА» первого, второго, третьего выпусков

**1. Наименование Эмитента.**
а) полное наименование:
на белорусском языке – закрытае акцыянернае таварыства «ЭРІА»;
на русском языке – закрытое акционерное общество «ЭРИА».
б) сокращенное наименование:
на белорусском языке – ЗАТ «ЭРІА»;
на русском языке – ЗАО «ЭРИА».

**2. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.**
Минский областной исполнительный комитет решением от 28.02.2007 № 196 зарегистрировал закрытое акционерное общество «ЭРИА» (далее – Эмитент) в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690602002.

**3. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**
223053, Минская область, Минский район, район деревни Боровая, 1, ком. 301а;
Телефон: (+375) 17 233 70 75, 233 77 03;
Электронный адрес (e-mail): area@area-hc.com.

**4. Основные виды деятельности Эмитента.**
В соответствии с общереспубликанским классификатором видов экономической деятельности Эмитент осуществляет следующие основные виды деятельности:
покупка и продажа собственного недвижимого имущества;
сдача внаем собственного недвижимого имущества.

**5. Номер расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных облигаций, наименование обслуживающего банка.**
Денежные средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных облигаций будут зачисляться на текущий (расчетный) счет № 3012601600016 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минская городская дирекция, код 963, УНП 690602002, адрес банка: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 24.

**6. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность Эмитента в составе, определенном законодательством.**
Бухгалтерская отчетность Эмитента в составе, определенном законодательством, будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее трех месяцев со дня окончания финансового года.

**7. Депозитарием, обслуживающим Эмитента, является** Депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» (зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 3 сентября 1991 года, регистрационный номер – 20), расположенный по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/0385593, срок действия лицензии до 18.07.2012.

**8. Размер уставного фонда Эмитента.**
Уставный фонд Эмитента составляет 8910000 (Восемь миллионов девятьсот десять тысяч) белорусских рублей.

**9. Сведения о проведении открытой продажи жилищных облигаций**

**9.1. Цель выпуска жилищных облигаций**
Целью выпуска жилищных облигаций является привлечение денежных средств физических и юридических лиц для осуществления финансирования строительства объекта «Многоквартирный жилой дом стандартных потребительских качеств в д. Боровляны Боровлянского сельсовета».

**9.2. Форма выпуска и вид жилищных облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость жилищных облигаций.**

| № выпуска / параметры | 1 выпуск | 2 выпуск | 3 выпуск |
|---|---|---|---|
| Форма выпуска и вид жилищных облигаций | Бездокументарные (в виде записей на счетах), именные, неконвертируемые | | |
| Валюта займа | Белорусские рубли | | |
| Объем эмиссии | **2188800000** (Два миллиарда сто восемьдесят восемь миллионов восемьсот тысяч) | **2351040000** (Два миллиарда триста пятьдесят один миллион сорок тысяч) | **1992600000** (Один миллиард девятьсот девяносто два миллиона шестьсот тысяч) |
| Количество жилищных облигаций (шт.) | 960 | 992 | 820 |
| Серия, номера жилищных облигаций | ЭР1 000001–000960 | ЭР2 000001–000992 | ЭР3 000001–000820 |
| Номинальная стоимость | **2280000** (Два миллиона двести восемьдесят тысяч) | **2370000** (Два миллиона триста семьдесят тысяч) | **2430000** (Два миллиона четыреста тридцать тысяч) |
| Эквивалент номинальной стоимости 1 жилищной облигации | 1 кв.м общей площади жилого помещения в строящемся объекте «Многоквартирный жилой дом стандартных потребительских качеств в д. Боровляны Боровлянского сельсовета» | | |

**9.3. Сведения об обеспеченности исполнения обязательств по жилищным облигациям.**
Исполнение обязательств Эмитента по жилищным облигациям обеспечивается заключенными с БРУСП «Белгосстрах» договорами добровольного страхования ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента жилищных облигаций (далее – договора страхования):

| | 1 выпуск | 2 выпуск | 3 выпуск |
|---|---|---|---|
| № и дата договора страхования | № 611087-001 от 26.08.2010 | № 611087-002 от 26.08.2010 | № 611087-003 от 26.08.2010 |
| Сумма страхования | 2188800000 (Два миллиарда сто восемьдесят восемь миллионов восемьсот тысяч) | 2351040000 (Два миллиарда триста пятьдесят один миллион сорок тысяч) | 1992600000 (Один миллиард девятьсот девяносто два миллиона шестьсот тысяч) |
| Срок действия договора страхования | С 6 сентября 2010 года по 5 марта 2012 года, в том числе период погашения – 3 месяца с 6 декабря 2011 года по 5 марта 2012 года | | |

БРУСП «Белгосстрах» (далее – страховщик) расположено по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 70.
При наступлении страхового случая владельцу жилищных облигаций (выгодоприобретателю) необходимо обратиться к страховщику с заявлением на выплату страхового возмещения.
Решение о признании заявленного случая страховым и выплате страхового возмещения оформляется страховщиком путем составления акта о страховом случае.
Страховое возмещение выплачивается в течение пяти рабочих дней со дня составления акта о страховом случае.
В случае расторжения договора страхования Эмитент обязан в течение 30 календарных дней с даты расторжения договора страхования произвести замену обеспечения исполнения обязательств по жилищным облигациям или осуществить выкуп жилищных облигаций, находящихся в обращении.

**9.4. Порядок размещения жилищных облигаций, место и время проведения открытой продажи жилищных облигаций.**
Период размещения жилищных облигаций с 6 сентября 2010 года по 25 ноября 2011 года включительно.
Размещение жилищных облигаций осуществляется путем открытой продажи физическим и юридическим лицам (резидентам и нерезидентам Республики Беларусь) (далее – покупатели) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
До момента приобретения жилищных облигаций, покупатели должны заключить с Эмитентом договор (соглашение) в простой письменной форме, предусматривающее обязательства Эмитента по организации строительства жилых помещений владельцам жилищных облигаций (далее – соглашение).
Размещение (открытая продажа) жилищных облигаций будет осуществляться профессиональным участником рынка ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, каб. 805.
Размещение жилищных облигаций осуществляется путем заключения договора открытой продажи жилищных облигаций (далее – договор).
Денежные средства на покупку жилищных облигаций по заключенным договорам перечисляются в белорусских рублях в наличной либо безналичной форме на счет, указанный в договоре, в установленный договором срок.
Размещение выпускаемых Эмитентом жилищных облигаций может осуществляться по цене, равной либо превышающей их номинальную стоимость (договорная цена).
В период проведения открытой продажи жилищных облигаций Эмитент имеет право сократить срок проведения открытой продажи жилищных облигаций первого, второго, третьего выпусков и принять решение об аннулировании неразмещенной части выпуска(-ов) жилищных облигаций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**9.5. Срок обращения жилищных облигаций.**
Срок обращения жилищных облигаций – 456 календарных дней с 6 сентября 2010 года по 6 декабря 2011 года включительно.
День начала размещения жилищных облигаций и день начала погашения жилищных облигаций считаются одним днем.

**9.6. Порядок выплаты доходов.**
Доход по жилищным облигациям не начисляется и не выплачивается.

**9.7. Условия и порядок возврата средств инвесторам в случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска жилищных облигаций.**
В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска жилищных облигаций Эмитент в срок не позднее 30 дней с момента принятия соответствующего решения возвращает владельцам жилищных облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты жилищных облигаций.

**9.8. Порядок и срок возврата средств владельцам жилищных облигаций при отказе от выпуска жилищных облигаций Эмитентом.**
В течение срока размещения облигаций Эмитент может принять решение об отказе от выпуска жилищных облигаций.
При отказе от выпуска жилищных облигаций Эмитент в срок не позднее 30 календарных дней с момента принятия соответствующего решения возвращает владельцам жилищных облигаций уплаченные ими денежные средства.

**9.9. Условия и порядок досрочного погашения Эмитентом жилищных облигаций.**
